Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародзяе	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок капітэрлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок капітэрлі насьпрад тэксту 1 р. — к.
За радок капітэрлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьмешныя на 50 проц. дарожай.
Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 сяр.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'ту—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў)

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 140 (2328) Серада, 20-га чэрвеня 1928 г.

Дзесяцігодзьдзе савецкае буйнае прамысловасьці.

Калі Савецкая ўлада рашыла пачаць праводзіць нацыяналізацыю прамысловасьці, меншавікі, эсэры, кадэты і фабрыканты зьдзекваліся над Саветамі і бальшавікамі, заяўляючы, што папершае, яны не падрыхтаваны да гаспадарчага будаўніцтва, падругое, на вдолеюць справіцца з такім складаным механізмам, як прамысловасьць. І сучасае не становішча зьяўляецца лепшым адказам нашым ворагам.

Ужо ў кастрычніку 1917 г. буйная індустрыя яўляла сабою сумнае зьявішча. Параўнаўча з 1916 годам прамысловая выпрацоўка 1917 г. склала 64 проц. Такое вострае скарачэньне вытворчасьці вельмі дрэнна адбілася на пэрагу галін прамысловасьці, якія пачалі развальвацца ў працягу 1915 і 1916 г. г.

У 1916 годзе параўнаўча з 1913 г. вытворчасьць вельмі востра скарацілася ў будаўнічай, дрэваапрацоўчай, харчовай, баваўнянай, шаўнянай, паперовай і паліграфічнай галінах. Да кастрычніка 1917 г. стала зусім ясным, што буржуазія прамысловасьць ня ўзьніме, што з прамысловае разрухі выхад адзін—захап улады, рабочы кантроль і паступовая нацыяналізацыя фабрык, заводаў і рудзікоў. Умоцнены ваенны націск і эканамічная блёкада з боку імпэрыялістычнага сьвету не дазволілі нам узьняць гаспадарку, і ў 1920 годзе, г. зн. у самым канцы ваеннага камунізму, прамысловая прадукцыя склала ўсяго толькі адну пятую частку даваеннае.

З 1921 году пачынаецца працэс адбудоўленьня, які праходзіў, літаральна, з казачнай шпаркасьцю, аб чым сьведчыць шэраг лічбаў: валавая прадукцыя буйнае дзяржпрамысловасьці (у мілёнах даваен. руб.) у 1921-22 годзе—850 млн. р., 1922-23 г.—1239 млн. р., 1923-24 г.—1621 млн. р., 1924-25 г.—2643 млн. р., 1925-26 г.—3750 млн. руб., 1926-27 г.—4.500 млн. руб., 1927-28 г.—магчыма 5450 млн. руб. У перадваенныя годы выпрацоўвалася буйнае індустрыі, прыкладна, на 4200 млн. р., так што ўжо ў 1926-27 г. даваенны ўзровень быў перавышан.

У працягу 5 гадоў мы павялічылі прамысловую прадукцыю больш, чым у пяць разоў, і гэта ня гледзячы на тое, што аж да 1924 г. мы ня мелі стойлівае валюты, што ў 1921-22 г. наша краіна цярпела голад, што з-за адсутнасьці сродкаў мы не маглі ўвесьці новых варштатаў па зьмену старым пасаваным.

Мала таго, нам удалося стварыць матар'яльныя ўмовы далейшага хуткага разгортваньня вытворчасьці, раней усяго, забясьпечыць штогодняе павялічэньне асноўных фондаў прамысловасьці. Ужо ў 1924-25 годзе было ўкладзена ў апошнюю 6,2 проц. усяго асноўнага «капіталу», а ў 1925-26 г.—13 проц. Калі заводы першы час будаваліся па 2 з пал.—3 гады, дык у сучасны момант ужо працуюць прадпрыемствы новае пабудовы; апрача таго, пакуль што мы асноўныя фонды ўзмацняем пераважна праз даабсталяваньне і пераабсталяваньне старых прадпрыёмстваў. Вось чаму мы маем магчымасьць у 1927-28 г. павялічыць вытворчасьць на 21 проц., а ў 1928-1929 годзе мяркуем павялічыць на 18-19 проц.

Эмігранты разьлічвалі, што па загрузцы старых фабрык, прамысловы рост прыпыніўся і пачнецца працэс праяданьня асноўнага «капіталу». Але мы здолелі ня толькі выкарыстаць зававанае ў Кастрычніку, але і стварыць новае. У сучасны момант гадавыя ўклады дасягаюць амаль паўтара міліярдаў рублёў у год. Будуюцца магутныя заводы па некалькі мільёнаў руб. коштам кожны, а мэталюргічныя велічы будуць каштаваць столькі, што за гэтыя грошы можна было-б прарыць Волга-Донскі канал ці другі Днепрастрой.

І трэба проста сказаць, што ў адносінах новага будаўніцтва СССР сапраўды ідзе наперадзе ўсіх краін сьвету, калі гаварыць не аб колькасьці, але аб якасьці. Мы будуем па адзінаму дзяржаўнаму пляну, і толькі першаклясны, калі ня лічыць нейкага процанту на нямінучыя памылкі першага пэрыяду будаўніцтва.

Пры ўсім тым, намі рашуча перабудоўваецца энэргетычная база прамысловасьці, і калі да рэвалюцыі яна была паравой і дробнастанцыённай электрычнай, дык зараз пар хутка замяняецца электрычнасьцю, а дробныя заводзкія электрастанцыі адыходзяць у мінулае і галоўным вытворцай электраэнэргіі зьяўляюцца раённыя цэнтральныя станцыі.

У адносінах да формаў кіраўніцтва савецкая індустрыя рачуча адрозьніваецца ад дарэвалюцыйнай. Там на чале кожнай фабрыкі стаяў фабрыкант, у нас-жа фабрыкі аб'яднаны ў трэсты ці ў губсавет народнай гаспадаркі. Там прамысловасьць разьвівалася стыхійна, вобмацкам, у СССР яна працуе і будуецца па адзінаму дзяржаўнаму пляну. Знойдзены зусім іншыя адносіны паміж людзьмі на фабрыцы і на заводзе. У буржуазных краінах фабрыка зьяўляецца мэханізмам з вельмі востра выяўленымі супярэчнасьцямі, у нас-жа на фабрыцы няма клясаў.

Улічваючы той факт, што мы ўжо стварылі шэраг новых вытворчасьцяй, напрыклад аўтамабільную, штучнага шоўку, хэмічную і г. д., і будуем заводы па каляровай мэталюргіі, пабудове трактараў і г. д., можна сказаць, што яшчэ праз дзесяць год посьпехі савецкай індустрыі будуць ня меншыя ў параўнаньні з 1928 годам, як зараз у параўнаньні з 1917 годам.

Нацыяналізацыя прамысловасьці ў руках саветаў апраўдала сябе ў СССР, апраўдае сябе і ў іншых савецкіх дзяржавах, да стварэньня якіх рыхтуецца ўвесь сусьветны пралетарыят.

НА ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКАЕ ПАРАЗУМЕНЬНЕ НЯМА НАДЗЕІ.

Вальдэмарас па звароце з Жэневы Коўню прыняў прадстаўнікоў прэсы, якім у сваіх адказах на запытаньні, зазначыў:

«Абвяшчэньне Вільні сталіцаю Літвы зьяўляецца даўняшняй унутранай справай Літвы. Ясная рэч—зазначыў Вальдэмарас—што пэўная колькасьць палякаў дзяржаў — маючы на ўвазе іхную ўласную палітыку, імкнецца ліквідаваць літоўска-польскі канфлікт або злучыць гэтыя дзьве дзяржавы".

На запытаньне прадстаўнікоў прэсы, ці магчыма чакаць зьліквідаваньня польска-літоўскага непаразуменьня, Вальдэмарас зазначыў, што гэта залежыць цалком ад Польшчы, якая ўладае Вільняю. Калі міністр Залескі—сказаў Вальдэмарас,—будзе далей трымацца такога-ж погляду як і да гэтае пары, дык на паразуменьне няма ніякае надзеі.

Літва № 2 (?).

Паводле прыватных чутак, якія распаўсюджваюцца ў Віленшчыне і ў Літве, польскія кіруючыя колы нібыта надумалі абвясьціць вільню сталіцаю літвы № 2, якая-б знаходзілася ў фэдэрацыі з Польшчаю. На чале гэтае «другое літвы» нібыта мае быць пастаўлены вядомы апэрэтачны бунтаўшчык генэрал Жэлігоўскі, які ў 1920 г. нібыта «узбунтаваўся» і, нарушыўшы сувалкскую польска-літоўскую ўмову, якая прызнавала Вільню за Літвою,—заняў Вільню.

Узнагарода за „забытыя заслугі".

Польская прэса паведамляе аб арганізацыі ў вайсковым міністэрстве спэцыяльнай камісіі для ўзнагароды „палёвымі знакамі" лётчыкаў, якія ўдзельнічалі ў налётах на савецкую тэрыторыю падчас савецка-польскае вайны ў 1920 г.

Сёньня мы маем 1928 г. Чаму такое спазьненьне? Ці не захвочваньне да новых налетаў?

Роспуск саюзу белагвардзейскае моладзі.

ВАРШАВА, 18-6. Газэта „Момант" паведамляе, што міністр унутраных спраў загадаў зачыніць аддзяленьне эміграцкага „саюзу расейскае моладзі" ва ўсёй Польшчы. Загад зроблен на падставе прапановы камісара Варшавы, які пасьля замаху на жыцьцё гандлёвага прадстаўніка СССР Лізарава зачыніў варшаўскае аддзяленьне саюзу.

Спешны зварот Залескага ў Варшаву

ВАРШАВА, 18-6. Залескі вярнуўся ў Варшаву на 2 дні раней, як думалі. Аўтарыя газэты паведамляюць, што дачасны прыезд Залескага ў Варшаву зьвязан з бягучымі пытаньнямі замежнае палітыкі.

АНГЕЛЬСКАЯ РАЗЬВЕДКА Ў БАЛТЫЦКІМ МОРЫ.

«Газэта Пораина» № 112 за 10-6 г. паведамляе, што у мінулым тыдні ангельская эскадра, у колькасьці 38 ваенных адзінак, накіравалася ў Балтыйскае мора.

Талін (б. Рэвель), у Літве—Клайпэду (Мэмель), у Фінляндыі—Гельсінгфорс, у Польшчы—Гдыню і, урэшце, вольны горад Данцыг.

У канцы чэрвеня караблі эскадры зрабілі адбудуцца манэўры ўсёй

ГРЭЦКІ ПРАЛЕТАРЫЯТ НА БАРЫКАДАХ.

Вулічныя бойкі. Сёньня будзе абвешчана ўсеагульная забастоўка.

ВЕНА, 18-6. З Белграду паведамляюць, што забастоўка на тытунёвых прадпрыёмствах у грэцкай Македоніі пашыраецца. У сабастовачны рух уцягнуты ўсе тытунёўшчыкі ў Грэцыі, а таксама рабочыя іншых галін прамысловасьці. У Салоніках, Драме, Кавальлі і Пірэі (порт Атэн) між бастуючымі і вайсковымі часьцямі адбываюцца крывавыя стычкі і сапраўдныя вулічныя бойкі. Водлуг апошніх, яшчэ не правераных, вестках, у Пірэі ўсю ноч на сёньня адбываліся вулічныя бойкі між бастуючымі і паліцыяй. Сэроба закліканых на падмогу паліцыі вайсковых часьцей зьнішчыць барыкады ня мела посьпеху.

Да забастоўкі тытунёўшчыкаў далучыліся чыгуначнікі і рабочыя электрычных станцый. 15-га чэрвеня ўночы ў Патрасе адбываліся вулічныя бойкі, у якіх забіта 30 рабочых і паліцэйскіх і паранена некалькі сот чалавек. Чакаюць, што сёньня будзе абвешчана ўсеагульная забастоўка ў Грэцыі.

ДА ПАУСТАЎШЫХ РАБОЧЫХ ДАЛУЧЫУСЯ ФЛЁТ.

ВЕНА, 18-6. З прычыны суровае цэнзуры і асаднага становішча, уведзенага ў райёнах, ахопленых забастоўкаю ў Грэцыі, паведамленьні з Белграду і Сафіі наконт паўстаньня ў Грэцыі ня могуць быць праверены.

Белградзкая газэта „Праўда" паведамляе, што флётылія, якая стаіць ля выспы Лесбасу, абвясьціла сябе салідарнаю з бастуючымі. Чыгуначныя зносіны між Грэцыяй і Югаславіяй часткова спынены. Венскія газэты паведамляюць з Пірэю, што грэцкае адміральтэйства адклікала панцырны карабель «Авараў», які вышаў у Міжземнае мора. Па ўсім краі адбываюцца масавыя арышты.

Грэцкае пасольства ў Югаславіі распаўсюджвае чуткі, нібыта грэцкая ўлада здолела перахапіць тэлеграму забастовачнага камітэту, адрасаваную ў Каміндтэрн з просьбаю аб дапамозе.

Прычэпка для разгрому кампартыі.

ВЕНА, 18-6. Аўстрыйскі і югаслаўскі друк зьмяшчаюць афіцыйныя паведамленьні грэцкае паліцыі, у якіх камуністы абвінавачваюцца ў арганізацыі ўзброенага паўстаньня.

БАЎГАРСКІ ЎРАД АБРАБАВАЎ АХВЯР ЗЕМЛЯЗДРЫГУ.

ВЕНА, 16-6. З Сафіі паведамляюць, што баўгарскі ўрад канфіскаваў ахвяраваныя 212 тысяч леваў, прысланыя праз нямецкую сэкцыю Міжрабпому на карысьць пацярпеўшых ад землязтрыгу на падставе таго, што „гэтая сума ахвяравана савецкімі прафсаюзамі", Адначасна канфіскавана 4 тысячы леваў, якія, як заявярае ўлада, «ахвяраваны баўгарскай кампартыяй».

СТАНОЎЧЫ ПЕРАЛОМ У САВЕЦКА-НЯМЕЦКІХ ДАЧЫНЕНЬНЯХ.

Увесь нямецкі друк выказваецца за ўпарадкаваньне спрэчных бакоў у адносінах абодвых краёў.

БЭРЛІН, 18-6. Абмяркоўваючы артыкул «Известий» аб нямецка-савецкіх дачыненьнях, «Кельнішэ Цэйтунг» піша: «Бясумоўна, што гэты артыкул мае важнае праграмнае значэньне і яго належыць ва ўсіх адносінах вітаць. Зробленыя «Известиями» прызнаньні аб нездавальняючасьці існуючае ўгаворнае асновы нямецка-савецкіх дачыненьняў для іх далейшага разьвіцьця супадае з нашым поглядам які ўжо паслужыў прычынаю для эканамічных перамоў у Бэрліне. Цяпер пры больш спрыяючых адносінах ёсьць магчымасьць падумаць аб адпаўленьні перамоў у больш шырокіх межах. Зараз-жа пасьля таго, як будзе скончана з шахцінскаю справаю, абодвы бакі павінны пачаць ажыцьцяўленьне гэтых пэрспэктыў».

* * *

БЭРЛІН, 18-6. Наконт артыкулу ў «Известиях» блізкая да Штрэзэмана газэта «Тэгліхе Рундшау» піша так: «Нямецкая сацыял-дэмакратыя да гэтага часу нічым ня выказала жаданьня зьмяніць нямецкую палітыку ў адносінах да СССР. Пры гэтым нямецкая сацыял-дэмакратыя ня трымаецца погляду, што добрасусэдзкія адносіны могуць доўга існаваць толькі тады, калі яны ўзаемны".

Нацыяналісцкая «Бэрлінэр Бэрзэнцэйтунг» піша: «Грамадзкая думка Нямеччыны спаткала з зацікаўленасьцю савецкія прапановы наконт больш сумленных у далейшым расейска-нямецкіх адносін. Зацікаўленасьць гэтая выяўляецца ў мерканьні, што расейскія прапановы ня будуць прадыктаваны старонпімі прычынамі партыйнага характару з мэтаю ўзмацніць камуністычную агітацыю сярод сацыял-дэмакратыі».

Антынямецкае выступленьне Залескага ў Парыжы.

ЗАЛЕСКІ ПРАПАНУЕ ЎСХОДНЯЕ ЛЁКАРНО.

ПАРЫЖ, 17-6. У часе побыту ў Парыжы Залескі на абедзе, наладжаным франка-польскай асацыяцыяй і таварыствам прыяцеляў Польшчы, спыніўся ў сваёй прамове на пытаньні аб эвакуацыі Рэйнскае вобласьці, зазначыўшы, што пытаньне аб бязапаснасьці як для Польшчы, так і для Францыі ўсё яшчэ мае першаступовае значэньне. Залескі заявіў: «З гэтае прычыны ўсе гарантыі, усе парукі, якія забясьпечваюць бязапаснасьць саюзьнікаў, надзвычайна каштоўны. Польшча не дапусьціць адмовы ад гэтых гарантый без надежнае компэнсацыі. Маё шчырае жаданьне—умацаваць франка-польскі саюз і, у поўнай згодзе з выдатнымі кіраўнікамі як францускімі, так і польскімі, зрабіць яго яшчэ больш эфэктыўным. Якраз таму, што Польшча магла абапірацца на гэты саюз, яна мела магчымасьць пры гандлёвых перамовах з Нямеччынаю ісьці па сваёй ахвоце да згоды да крайніх межаў».

Пратэст нямецкае грамадзкасьці проці выступленьня Залескага.

ДАНЦЫГ, 18-6. Учора ў Данцыгу зачыніўся зьезд нямецкага саюзу рэйнскіх правінцый. Ухваленая рэзалюцыя катэгарычна патрабуе вызваліць Рэйн ад акупацыі. Рэзалюцыя вострая пратэстуе проці выступленьня Залескага, зазначаючы, што ён дамагаўся ўдзелу нямецкага ўраду ва ўсходнім Лёкарно. Рэзалюцыя патрабуе вострага адпору такім дамаганьням Польшчы.

Пасьля зьезду, у прыгранічным гарадку Майенбурсе адбылася вялікая дэманстрацыя, наладжаная ўдзельнікамі зьезду. На дэманстрацыю прыехала з Нямеччыны некалькі тысяч чалавек. Прамоўцы зазначалі на схожасьць лёсу Данцыгу і Рэйнскае вобласьці, а таксама, што гэтыя каштоўныя нямецкія правінцыі павінны заставацца нямецкімі.

РЭФАРМІСЦКАЯ „БАРАЦЬБА" ЗАКЛІКАМІ ДА КАПІТАЛУ.

ПАРЫЖ, 15-VI. З Жэневы паведамляюць, што на канфэрэнцыі міжнароднага бюро працы пры Лізе Нацый скончыліся спрэчкі па дакладу Альбэра Тома наконт дзейнасьці бюро Тома ў прамове спыніўся, пераважна, на спробах ангельскага ўраду дамагчыся перагляду пастановы Вашынгтонскае канфэрэнцыі аб 8-мігадзінным рабочым дні. Гэтую частку прамовы Тома скончыў заклікам да ангельскага ўраду супакоіць рабочых і дапамагчы міжнароднаму бюро дамагчыся зацьверджаньня канвэнцыі ўсімі дзяржавамі.

Сацыял-патрыёты Пуанкарэ-вайны.

ПАРЫЖ, 16-VI. У палаце дэпутатаў пачаліся спрэчкі аб агульнай палітыцы ўраду. Аднаямляючы з пазіцыяй сацыялістычнае фракцыі Арыёль заявіў:—«З каго-б ні складалася ўрадавая большасьць, мы будзем галасаваць за ўсе ўрадавыя мерапрыёмствы, якія адпавядаюць інтарэсам краю і прыхільнікаў захаваньня спакою».

Працэс удзельнікаў наскоку на брусельскую выстаўку ВОКС'а.

ПАРЫЖ, 18-6. Брусельскі папраўчы суд прызнаў падсудную сабе справу наконт наскоку сяброў „Нацыянальнага саюзу моладзі" на выстаўку Усесаюзнага таварыства культурнае сувязі з заграніцаю („ВОКС'а") у Брусэлі ў студзені месяцы. Разгляд справы распачаўся 14-га чэрвеня, прычым абарона даводзіла, што справа падсудна не папраўчаму суду, а суду прысяжных заседачоў. Прысуд будзе абвешчан праз тыдзень.

Сэнсацыйны працэс.

ПАРЫЖ, 14-VI. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Жонка Барыса Салаўёва (расейскі белы эмігрант), дачка Распуціна, узьняла справу проці ранейшага князя Фэлікса Юсупава і проці вялікага князя Зьмітра Паўлавіча, абвінавачваючы іх у адказнасьці за забойства яе бацькі ў сьнежні 1916 г. у Петраградзе. Салаўёва патрабуе выплаты адшкадаваньня ў разьмеры 25-ці мільёнаў франкаў».

Стачка марсэльскіх матросаў.

ПАРЫЖ, 18-6. У Марсэлі абвясьнілі забастоўку матросы ўсіх буксырных параходаў, пратэстуючы проці няпраўнага звальненьня мэханіка аднаго з буксырных суднаў. Параходы, якія прыходзяць у Марсэль, ня могуць увайсьці ў порт.

На выратаваньне Нобіле.

„Малыгін" абагнаў „Пэрсея".

Лёдакол «Малыгін» 17-6. Малыгін прайшоў пад 74 градусам паўночнае шырыні, трымаючы курс на выспу Надзею. Настала вострае пахаладаньне. Учоры абагнаны „Пэрсей", які ідзе ўздоўж кромкі лёду па 30-м мэрыдыяне.

ФІНСКІ ГІДРАСАМАЛЁТ ВЯРНУЎСЯ.

ОСЛО, 18-6. Фінляндзкі гідрасамалёт, які вылянеў сёньня з Тромсэ на Шпіцбэрген, вярнуўся, бо ён вельмі перагружан.

СТАЧКА ЛАТВІЙСКІХ ГАРБАРОЎ.

БАСТУЮЧЫМ ПАТРЭБНА ДАПАМОГА.

РЫГА, 18-6. Забастоўка рабочых гарбарнае прамысловасьці Рыгі ня спыняецца ўжо трэці тыдзень. Рыскае цэнтральнае бюро прафсаюзаў (рэвалюцыйная арганізацыя) зьвярнулася да камітэту адзінства савецкіх і скандынаўскіх прафсаюзаў і да прафсаюзаў абутковае прамысловасьці ў Нарвэгіі, Фінляндыі, Эстоніі і СССР за маральнаю і фінансавою дапамогаю.

АДМОВА Ў ЛЕГАЛІЗАЦЫІ НОВАЕ РАБОЧАЕ ПАРТЫІ.

РЫГА, 18-6. Латвійскі дру паведамляе, што міністэрства ўнутраных спраў адмовілася зарэгістраваць статут новае рабочае партыі—„партыі рабочых і рамесьнікаў" в прычыны таго, што праграма яе «занадта левая».

ПАШЫРЭНЬНЕ СЕТКІ ЧАСОВЫХ КАНТРОЛЬНЫХ КАМІСІЙ.

Абежнік УЦСПС і ВСНГ СССР прафсаюзным і гаспадарчым арганізацыям.

Надаючы вялікае значэньне прыцягненьню рабочае масы да пытаньняў арганізацыі і кіраўніцтва прамысловасьцю, а таксама выкарыстаньню вопыту мас для ўдзелу рабочых у справе рацыяналізацыі вытворчасьці і рэканструкцыі прамысловасьці, прэзыдыум УЦСПС і прэзыдыум ВСНГ СССР прызналі патрэбным пашырыць сетку часовых кантрольных камісій.

Улічваючы посьпех працы часовых кантрольных камісій, пленум УЦСПС знашоў патрэбным пашырыць кола ЧКК, пераходзячы паступова ад вопыту да сыстэмы іх арганізацыі, як часовых органаў вытворчае нарады.

УЦСПС і ВСНГ прапануюць кіраванцы пры пашырэньні сеткі ЧКК такімі палажэньнямі: ЧКК арганізоўваюцца ў тэкстыльнай, горнай, хімічнай і мэталёвай прамысловасьці на ўсіх прадпрыёмствах, якія налічваюць ня менш 500 працуючых, у харчовай, дрэваапрацоўчай, будаўнічай, гарбарнай, паліграфічнай, швейнай і паперовай прамысловасьці—на ўсіх прадпрыёмствах, якія налічваюць ня менш 300 чалавек працуючых. У цукровай прамысловасьці часовыя кантрольныя камісіі арганізуюцца на цукрова-пясочных і рафінадных заводах, якія налічваюць больш 1.000 чалавек працуючых.

ВСНГ і УЦСПС лічаць, што ў першую чаргу трэба арганізаваць часовыя КК на прадпрыёмствах, дзе ёсьць сур'ёзныя заганы ў будаўніцтве і выкарыстаньні абсталяваньня, а таксама там, дзе праводзіцца буйная капітальная праца. На прадпрыёмствах, дзе праводзіцца буйная капітальная праца, у склад часовае КК абавязкова павінны ўваходзіць прадстаўнікі будаўнічых рабочых. Бяручы пад увагу, што часовыя кантрольныя камісіі зьяўляюцца органамі масавага кантролю, неабходна заснаваць узаемную і шчыльную сувязь іх з мясцовымі органамі РСІ.

УЦСПС і ВСНГ СССР прапануюць усім прафэсыянальным арганізацыям і гаспадарчым установам зьвярнуць асаблівае сур'ёзную ўвагу на рашучае адхіленьне ўсіх выпадкаў валакіты і фармальных адносін да працы кантрольных камісій.

Старшыня УЦСПС Томскі.

Старшыня ВСНГ СССР Куйбышаў.

Дзень за днём рыхтавацца.

(З перадавіцы „Правды").

«Правда» у перадавіцы пад загалоўкам «Аб падрыхтоўцы да асеньняга засеву», зазначаючы, што асеньні засеў у значнай меры папераджае наперад разьмеры прадукцыі земляробства на некаторы пэрыяд, прынамсі на некалькі месяцаў, піша:

Трэба арганізаваць і правесьці засеўную кампанію так, каб: пашырыць азімы клін, прычым найбольшае пашырэньне павінна прыпасьці на пшаніцу; узьняць валавую прадукцыю азіміны, а яшчэ больш яе таварную частку; пры гэтым, пашырыць удзельную вагу аграмаджанага сэктару сельскае гаспадаркі. Мы павінны зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу, каб не паўтарыць памылак леташняе веснавое кампаніі. Такіх недарэчных зьявішчаў, калі бяз сыстэмы разьмяркоўваецца насеўны матар'ял, калі сел.-гас. машыны іржавеюць на складах, чакаючы «дакумантаў», а часам колаў, калі да апошняга моманту невядома, што будзе з крэдытамі, калі працоўнаму жыхарству не растлумачваюць мерапрыёмстваў ураду, калі ў самы разгар засеву даручаюць сэрыямі праводзіць іншыя кампаніі ці абсьледваньні.

Такія „зьявішчы" трэба нішчадна выгнаць з нашае практыкі.

Паўтараем, што да асеньняга засеву трэба ўважліва дзень за днём рыхтавацца. Ніякае інэртнасьці, заспакоенасьці, пасыўнасьці. Хто сьпіць, або пазяхае, таго трэба падштурхнуць. Нельга ні ў якім разе дапушчаць бюракратычнага адкладу тэрміновых, важных і жыцьцёва-неабходных мерапрыёмстваў. Масавую працу на вёсцы, нашую кампанію па растлумачэньні, ад якое паралізуецца ўплыў кулацтва, трэба ўзьняць на належную вышыню. Будзем мець на ўвазе, што ўдалае правядзеньне засеўнае кампаніі абяцае нам з посьпехам перамагчы шмат якія цяжкасьці, а гэта зьявіцца дадатковым стымулам да новага ўздыму.

ЯПОНІЯ ЗАБІРАЕ ШАНДУНЬ У КІТАЯ.

ТОКІЁ, „Токіё Асахі" паведамляе, што японскі ўрад у якасьці гарантый, папераджаючых інцыдэнты, аналёгічныя цзынаньскаму, дамагаецца, каб Цынтао і Цынань былі абвешчаны «вольнымі гарадамі», кітайскі гарнізон павінен быць выведзен з гэтых гарадоў, і Японія павінна атрымаць кантроль над фінансамі і кіраўніцтва Шандуньскай чыгункай.

Савецка-японскае культурнае зблiжэньне.

ТОКІЁ, 16-6. Адбылося сьвяткаваньне стагодзьдзя ад дню нараджэньня Льва Талстога, наладжанае рэдакцыяй газэты «Какумін». На сьвяткаваньні выступалі паўнамоцны прадстаўнік СССР у Японіі Траяноўскі і вядомы жураліст Такутамі.

НА ПАВАРОЦЕ.

(Ад уласнага бэрлінскага карэспандэнта).

Гэты год для Нямеччыны зьяўляецца годам паваротным. Папершае, з гэтага году значна павышацца сума рэпарацыйных узносаў, а падругое, на сцэну палітычнага жыцьця выступіла партыя сацыял-дэмакратаў.

Два гады нямецкія сацыялісты ня бралі ўдзелу ў палітычнай дзейнасьці і маўкліва нагледзелі рэакцыйныя ўчынкі ўраду манархічных тэндэнцый. Цяпер гульня ў маўклівасьць скончылася, і жыцьцё патрабуе дзеяньняў.

Ні больш, ні менш, як 9 мілёнаў працоўных аддалі сацыялістам свае галасы ў надзеі, што шэйдэманаўцы ў саюзе з камуністамі расьсякуць тыя вузлы, што навязала на шыю рабочаму ўлада каталіка Маркса і нацыяналіста Кейдэля.

Але нямецкія сацыялісты ня былі-б сацыялістамі, калі-б яны не пачалі са згодніцтва. Наперакор волі абраўшых іх мас, яны пачалі сваю палітычную кар'еру з заснаваньня габінэту вялікае каліцыі. Каліцыйны ўрад яшчэ, праўда, канчаткова не сфармаваны, не знайшоў адпаведных асоб. Але справа не ўсобах, а ў прынцыпе. Важна тое, што сацыял-дэмакратычныя правадыры пастанавілі пайсьці на згоду з партыямі буйнае буржуазеі. Іншымі словамі: заснаваць выканаўчы камітэт трэсту нямецкіх капіталістаў.

Сацыял-імпэрыялізм,—гэтак характарызуюць левыя нямецкія газэты надыходзячую эру жыцьця Нямеччыны. Замест чаканага вызваленьня мас, увядзеньня васьмігадзіннага рабочага дню, зьнішчэньня мытаў на рэчы харчаваньня і першае неабходнасьці, пабудовы новых кватэр і інш.—абываталю абяцаюць паднесьці зьбітыя матывы Лёкарно, франка-нямецкі ваенны саюз (апошняя палітычная навіна) і агульнаэўрапейскі фронт проці Саюзу ССР. Апошні пункт асабліва імпануе настроям шэйдэманаўцаў. Ні адна газэта Нямеччыны ня піша з такой злосьцю па адрасу СССР, як газэта с. д.—вядомая «Форвэртс». Выступленьні «Форвэртс» такія злыя і атрутныя, што яе матар'ялам карыстаецца нават кадэцкі «Руль»—самы злы, водлуг слоў Максіма Горкага, эміграцкі лістоК.

Для пачатку, праграма, як бачыце няхепская. Што з гэтага выйдзе—справа іншая. Мы добра памятаем палітыку сацыялістаў у саюзе з буржуазеяй. Яе вынікамі была інфляцыя, акупацыя прырэйнскіх вобласьцяй, зьбяднеьне мас і як рэакцыя на ўсё гэта—прыход да ўлады «ратаўніка» (у агітацыйных прамовах ён так уласна і называўся) Гіндэнбурга.

Таму з тайнай трывогай наглядае, пачынаючы з сацыял-дэмакратаў, нямецкі абываталь і зараз, а камуністычная партыя выступіла з гарачай адозвай да ўсіх рабочых не дапускаць каліцыі, бо яна нічога путнага працоўнаму не абяцае.

Можна з упэўненасьцю сказаць, што недалёка той дзень, калі нямецкія рабочыя пашкадуюць аб аддадзеных сацыялістам галасох. Палітыка вялікае каліцыі скончыцца крахам,—у гэтым ня трэба сумявацца. Шляхі нямецкае рэвалюцыі яшчэ ня скончаны.

Да адчыненьня новага рэйхстагу і заснаваньня новага ўраду, генэральны агент па рэпарацыях Паркер Джыльбэрт (ён-жа нясласны дыктатар Нямеччыны) агаласіў справаздачу за мінулы рэпарацыйны год, а заадно выказаў свае пажаданьні на будучы год. Наколькі нам вядома, ніхто ніякі год не канчаецца сярод лета, калі і справаздачы выпісваць няма каму. І калі, засеўшы на Луізэнштрасэ янкі справаздачу ўсё-ж такі агаласіў, дык эрабіў ён гэта з пэўным намерам. Джыльбэрт жадае ўказаць наперад праграму дзеяньняў новаму рэйхстагу. Ці трэба гаварыць аб тым, што пажаданьні, ці ўказаньні наперад Джыльбэрта,—гэта тое самае, што загад. Нямеччына даўно страціла твар і волю. Яе жыцьцё накіроўваецца пераможцамі ў асобе іх непасрэднага агента Паркера Джыльбэрта.

Пажаданьні рэпарацыйнага агента ў гэтай справаздачы зусім нядвусэнсна зазначаюць на неабходнасьць павышэньня г. зв. рэпарацыйных плацяжоў, ці плацяжоў кантрыбуцыі. Да гэтае пары Нямеччына плаціла 2 з пал. міліярды залатых марак штогод. Цяпер гэтая сума павінна быць павялічана. Калі ўзяць 2 з пал. міліярды, ды раскласьці на плацельшчыкаў падаткаў, дык выйдзе, што на галаву кожнага працоўнага Нямеччыны прыдзецца ў год 1500 марак. Гэта толькі грашыма. А ёсьць яшчэ пастаўкі і таварамі, вугалем, сталлю, будаўнічымі матар'ялямі і інш. Нямеччыне прыходзіцца ведаць усе адмоўныя бакі паражэньня. Недарма гаварыцца: гора пераможаным.

Асабліва палюбіліся рэпарацыйнаму агенту нямецкія чыгункі. Такіх высокіх тарыфаў, як у Нямеччыне, няма ва ўсім сьвеце. І ўсё яшчэ мала—Джыльбэрт жадае новага павышэньня. На павышэньне ўрад наўрад ці згодзіцца, але ад новага звальненьня чыгуначных служачых не адмовіцца. А гэта пагражае тым, што ў Нямеччыне пачнуць перасоўвацца пешшу. Ужо і цяпер нямецкія чыгункі пабілі ўсе рэкорды ў сэнсе катастрофаў, узяць да прыкладу хоць-бы апошнюю катастрофу пад Нюрнбергам: 24 забітых і каля 150 параненых. Ці-ж гэта не катастрофа?

А ўсё гэта здараецца таму, што не хапае служачых. Іх звольнілі па патрабаваньні пляну Дауэса, а цяпер у нямецкі поезд небясьпечна садзіцца.

Янка Б.

Бэрлін, чэрвень 1928 г.

Справа шахцінскіх контр-рэвалюцыянэраў.

(26-ты дзень працэсу).

Пасьведчаньні нямецкага інжынэра Гобэ.

На вячэрнім пасяджэньні суду па шахцінскай справе 18-га чэрвеня абаронца Юшкевіча Малянтовіч узьняў хадайніцтва, каб далучыць да справы некаторыя дакументы, якія характарызуюць мінулую дзейнасьць падсуднага, а таксама некаторыя яго артыкулы, зьмешчаныя ў часопісі „Уголь и Железо“. Хадайніцтва абароны здавальняецца, аднак суд адмаўляе далучыць да справы артыкулы, бо яны ня маюць непасрэднага значэньня.

Крыленка паведамляе, што на імя пракуратуры Вярхоўнага суду СССР пададзена заява нямецкага інжынэра Гобэ, які працаваў на коксавых прадпрыёмствах Донвугалю. Гобэ заяўляе, што ў яго працы перашкаджалі контр рэвалюцыйныя інжынэры Рубановіч, Чарненка, Баярышнаў, Казарынаў і інш, і лічыць з гэтае прычыны патрэбным даць суду свае паказаньні. Крыленка лічыць, што хадайніцтва інжынэра Гобэ павінна быць задаволена. Абарона не супярэчыць. Спэцыяльны склад Вярхоўнага суду ўхваляе выклікаць інжынэра Гобэ ў якасьці сьведкі па справе.

Незапэўняючыя дакументы.

Далей Крыленка паведамляе аб атрыманьні завераных дакументаў: 4 дакументы ад Кестэра, пяты—ад заводзкага камітэту фірмы Кнаўп і шосты дакумант—заява Зэебольда. Абвінавачаньне лічыць, што гэтыя дакументы павінны быць разгледжаны. Далей Крыленка паведамляе, што дакумант заводзкага камітэту фірмы Кнаўп лічыць, што накіраваныя ў СССР машыны таксама прыгодны для працы як і машыны пасланыя ў Францыю. З прычыны таго, што праверыць гэты факт нельга, гэты дакумант асаблівага значэньня ня мае. У іншых дакументах зьмешчаны заверэньні з прысягаю Кестэра і Зэебольда і беспадстаўныя адхіленьні заяў Бадштыбера аб іх шкодніцкай працы. Па законах СССР прысяга не зьяўляецца доказам на судзе. Савецкі закон фармальна забараняе прысягу ў якасьці доказу. Гэты фармальны бок пазбаўляе такія дакументы каштоўнасьці. Апроч таго, паказаньні Зэебольда і Кестэра маюць выразна супярэчныя заверэньні. Лічачы, што суд павінен даць сваю ацэнку гэтым дакументам, даяржаўны абвінавачаньне выказаецца толькі проці далучэньня да справы дакументу, у якім Зэебольд кажа, што ня ведаў раней Гаўрушчанкі, бо гэты факт ужо адхілен.

Суд ухваляе: з прычыны таго, што пададзеныя дакументы зьмяшчаюцца на 21 друкаваным аркушы, суд павінен азнаёміцца са зьместам іх, каб вырашыць пытаньне, ці далучыць іх да справы, ці не.

Заява Зэебольда.

Крыленка паведамляе пра атрыманую заяву таго-ж Зэебольда, што ён прыехаў у Маскву і дабраахвотна аддае сабе ў рукі Вярхоўнага суду. Як вядома, ужо была пастанова Вярхоўнага суду, што пракуратура зробіць дазнаньне наконт учынкаў Зэебольда.

«Я лічу сваім абавязкам заявіць Вярхоўнаму суду,—кажа Крыленка — што пракуратура абмяжуецца ў адносінах да Зэебольда, паколькі ён ужо прыехаў у Маскву, найбольш мяккімі мерамі—возьме ад яго падпіску аб нявыезьдзе. Старшыня заўважае: «У зьвязку з ранейшаю пастановаю суду, які, на падставе 315 арт. Крым. Працэсуальнага Кодэксу, даручыў пракуратуры зрабіць па гэтай справе належнае расьсьледаваньне,—пытаньне лічыць вычарпаным».

Што паказаў Кржыжаноўскі.

Суд пераходзіць да допыту Кржыжаноўскага. Ён—інжынэр. Працаваў у кіраўніцтве новага будаўніцтва Донвугалю. Самаўпэўнена паведамляе, што быў на выбары адказным прадпаўніком некалькіх прафсаюзных арганізацый на Украіне. У практычным адделе Донвугалю Кржыжаноўскі пачаў працаваць у кастрычніку 1925 году ў якасьці галоўнага інжынэра.

Пачатакам свайго ўдзелу ў контр-рэвалюцыйнай арганізацыі падсудны лічыць размову з Матавым у чэрвені 1926 году. У габінеце Матава ў прысутнасьці падсуднага Братаноўскага і інжынэра Завадзкага Матаў казаў, што ненармальнае прававое становішча інжынэрства прымусіла галоўных інжынэраў ужыць некаторыя захады. Падсудны зразумеў, што інжынэрства зьбіраецца сабатаваць і ня выконваць сваіх абавязкаў.

Кржыжаноўскі на запытаньне старшыні прызнае, што пасьля гэтае размовы ён зразумеў мэту контр-рэвалюцыйнае арганізацыі. Падсудны далей прыпамінае, што са слоў Матава была відаць гатоўнасьць раненйшых гаспадароў фінансаваць інжынэраў. Аднак, Кржыжаноўскі заявляе, што зразумеў усё выразна, асабліва сувязь з эканоміцаю, толькі пасьля таго, як ён „усё абдумаў“.

Крыленка зазначае на 4 моманты шкодніцкае дзейнасьці падсуднага: Праца ў управе новага будаўніцтва (УНС), узаемаадносіны падсуднага з амэрыканскаю фірмаю «Стуарт», становішча працы контр-рэвалюцыйнае арганізацыі і дзейнасьць Кржыжаноўскага, якая падлягае абмеркаваньню на зачыненым пасяджэньні.

Ці можна лічыць,—пытае т. Крыленка,—што ўся управа новага будаўніцтва зьяўлялася апаратам, які ў вялікім абхвае праводзіў арганізаваны сабатаж у сэнсе метадаў і сістэмы працы?

— Так,—адказвае падсудны,—гэта быў орган сабатажу.

— А тэхнічны савет спрыяў гэтаму сабатажу?

— Так, тэхнічны савет быў фіранкою, але ў самім арганізаванага сабатажу ня было.

— Там ня было пракурора? — пытае Крыленка.

— На было—адказвае Кржыжаноўскі пад агульны рогат: там усе былі абаронцамі.

Характарызуючы працу на асобных капальнях, Кржыжаноўскі называе яе выразна шкодніцкаю.

У канцы вячэрняга пасяджэньня суду было паведамлена, што прыехала выкліканая экспэртная камісія ў складзе прафэсароў Паўлава, Губкіна і Фінкельштэйна. Пасьля кароткае нарады суд перадаў экспэртам зацьвержаны ім сьпіс запытаньняў, да якога далучаны і некаторыя дахатковыя запытаньні абароны. Прафэсар Губкін заявіў, што праца экспэртнае камісіі будзе скончана праз 4—5 дзён.

У Саюзе ССР.

НАПЕРАД ДА ПЕРАМОГІ НАД СТЫХІЯЙ.

МІЖНАРОДНЫ КАНГРЭС ПА ВЫВУЧЭНЬНІ ПОЎНАЧЫ.

ЛЕНІНГРАД. У залі Акадэміі Навук адчыніўся другі кангрэс міжнароднага таварыства па вывучэньні Арктыкі, на паветраным караблі. На адчыненьні прысутнічаў навуковы сьвет Ленінграду, консульскі корпус, установы, зьвязаныя з вывучэньнем Поўначы.

Кангрэс адчыніў уступнаю прамоваю старшыня Аэра-Арктыкі Фрытьёф Нансэн, які дзякаваў савецкую ўладу за шчыры прыём і ўсе выгоды для працы. Ад імя Акадэміі Навук зьезд вітаў Карпінскі. Таксама заслуханы прывітаньні, перададзеныя па радыё, ад „Красіна“ і „Малыгіна“, а таксама прывітальныя тэлеграмы тав. Калініна, ТДА-Авіяхіму і ад чужаземных вучоных.

Выступіўшы ад імя камітэту малых народнасьцяй поўначы прафэсар Тан-Багараз адзначыў вялікае значэньне для сьвету вывучэньня паўночных краёў і прыцягненьня да гэтага народнасьцяй Поўначы.

Аўганскія самалёты ў Маскве.

МАСКВА, 18-6. 17 чэрвеня прыляцелі ў Маскву з Бэрліну і зьнізіліся на цэнтральным аэрадроме імя Фрунзэ тры аўганскіх пасажырскіх самалёты сыстэмы «Юнкерс». Самалёты з Масквы вылятуць у Харкаў, а потым палятуць у напрамку Армавір—Баку—Тэгеран—Кабул.

Хлебазагатоўкі ізноў узьнімаюцца.

МАСКВА, 18-6. Згодна папярэдніх даных НК Гандлю СССР, за 3-ю пяціднёўку чэрвеня загатоўлена 73348 тон хлебапрадуктаў.

БАРАЦЬБА ЗА КІРАЎНІЦТВА РАБОЧЫМ РУХАМ.

(Пасьля Тулускага кангрэсу францускіх сацыялістаў).

Пасьля сацыялістычнага кангрэсу ў Тулузе адно можна лічыць цьвёрда ўстаноўленым: усе плыні ў францускай сацыялістычнай партыі абвясьцілі камунізму вайну не на жыцьцё, а на сьмерць.

Клемансо ў свой час заявіў: «Барацьба між буржуазеяй і рабочай клясай зьяўляецца пытаньнем моцы». Формула гэта цяпер больш, чымся калі-небудзь, адпавядае становішчу рочаў. Яе трэба толькі дапоўніць словамі Рэнодэля і Жэромскага:

— Між сацыялізмам і камунізмам, між II і III Інтэрнацыяналамі барацьба толькі і можа весьціся не на жыцьцё, а на сьмерць.

І рэзалюцыя Тулускага кангрэсу пацьвярджае гэта.

Калі склікаўся Камінтэрн, сацыялісты са зьнявагай аднесьліся да яго. На іх баку заставаліся старыя кадры, абагачаныя вопытам, якія карысталіся давер'ем рабочае клясы; на іх баку былі дэпутаты, каапэрацыя і ў першую чаргу вялізарны апарат рэфармісцкіх прафсаюзаў. Перад сабою яны бачылі рух, які ўзьнік у адказ на заклік савецкае рэвалюцыі, шукаў прыхільнікаў і вербаваў іх сярод маладых былых удзельнікаў вайны, сярод рабочых, ня маючых мінулага, часта невядомых і ня маючых ніякага аўтарытэту.

Але мінула 8 гадоў і за гэты перыяд посьпехі Камінтэрну з вялікай выразнасьцю выявілася ва ўсіх краінах. Асабліва паказальнымі ў гэтых адносінах былі апошнія выбары ў Францыі і ў Нямеччыне.

У Францыі сацыялісты загадзя падрыхтавалі сваё выступленьне проці „бальшавізму“. Яны змагаліся за выбары па райёнах з адзінаю мэтаю перамагчы камуністычную партыю. Калі-ж вынікі выбараў зрабіліся вядомымі, расчараньне сацыялістаў было бязьмежна. Ва ўсіх частках краіны, нават у самых далёкіх кутках яе, сымпатыі да кампартыі, проці якое сацыялісты змагаліся самымі рознастайнымі спосабамі, усё больш растуць.

Праз палітычныя махінацыі, з дапамогаю выданага спэцыяльна для гэтае мэты прадвыбарчага закону, сацыялістам удалося зьменшыць прадстаўніцтва камуністычнае партыі ў парляманце. Але яны не маглі перашкодзіць таму, каб мілёён з лішкам рабочых выказаліся за камуністаў. І калі ўсё гэта вызвалася, сацыялістычных правадыроў агарнуў жах. Ды і сапраўды, калі з агульнае колькасьці пададзеных за сацыялістаў галасоў вылічыць галасы буржуазных выбаршчыкаў, якія ў вялікай колькасьці галасавалі за сацыялістаў, дык акажацца, што кампартыя атрымала толькі трохі менш галасоў, чымся сацыялісты. Камуністычная партыя ўсюды прыцягвае да сябе рабочых і сялян, якія пакідаюць шэрагі сацыялістаў. Становішча для сацыялістаў робіцца вельмі сур'ёзным. Яшчэ адзін такі зрух—і камуністы акажуцца ў Францыі больш шматлікімі, чымся сацыялісты.

Вось супроць гэтае небясьпекі і паўстаюць адначасова і з аднолькавай рашучасьцю як правыя, так і левыя сацыялістыя, якія пагражае аднолькавая небясьпека ґічкія запалены аднолькавым імкненьнем нанесьці «сьмяротны ўдар» камуністычнай партыі.

Як гэта ўсё магло здарыцца? Якім чынам, напрыклад, камуніст Дюкалё мог перамагчы сацыяліста Блюма? Блюм, апынуўшыся па-за парлямантам, да гэтае пары з сумам ставіць гэта пытаньне—і ў цэнтральным органе францускае сацыялістычнае партыі «Популер» адказвае на яго. Аказваецца, камуністы «ўзялі» сваю праграму ў сацыялістаў. Больш таго: камуністы, як відаць, пазбавілі сацыялістаў іхняе праграмы.

Блюм зусім правы. Камуністы «адабралі» сацыялістычную праграму ў правадыроў 2-га Інтэрнацыяналу, якія згубілі яе. І ў гэтым, бязумоўна, галоўная прычына посьпехаў камунізму. Вось два прыклады: Левін і бальшавікі захапілі ўладу ў б. Расеі і выкарысталі гэту ўладу, каб ажыцьцявіць на магчымасьці поўнасьцю сацыялізм. «Сацыялісты» Макданальд узяў у Англіі ўладу ў свае рукі і выкарыстаў яе для ўмацаваньня ангельскага імпэрыялізму.

Так, камуністы перанялі дактрыну і тактыку марксызму. Але яны абагацілі яе вопытам, дасягненьнямі ўсеКП(б), у той час, як сацыял-дэмакраты адмовіліся ад марксызму і пайшлі па шляху згодніцтва і супрацоўніцтва з буржуазеяй.

Застануцца яны на гэтым шляху і далей, ня гледзячы на ўсю „левую“ балбатню некаторых удзельнікаў Тулускага кангрэсу. Уставіць у рэзалюцыю некалькі хлусьлівых сказаў аб клясавай барацьбе і ў той-жа час ухваліць пастанову падтрымліваць Пуанкарэ пры дапамозе Б'юіссона, Тома, Бонкура, каб дамагчыся буйных пасад і давер'я буржуазеі,—гэта значыць абдурваць рабочых, гэта значыць яшчэ раз здрадзіць праграме сацыялізму, гэта значыць далучыцца да «нацыянальнага яднаньня», супроць якога сацыялісты вядуць чыста паказальную, фальшывую барацьбу.

Праграма сацыялізму ў руках камуністаў, і толькі ў іхніх руках—вось чаму рабочыя ідуць у іхнія шэрагі. І абвяшчэньне крыжавога паходу камунізму, якім награжаюць сацыялісты ўсіх водценяў, паказвае, што камунізм сапраўды зрабіўся небясьпечнай сілай. Вось чаму ўсюды—ад Коці да Бюно-Варыллы, ад Саро і Пенлеве да Бонкура, Тома і Жэромскага—усюды гучаць тыя-ж галасы нянавісьці і тыя-ж пагрозы па адрасу камуністаў. Гэты-ж «адзіны фронт» сацыялістаў і буржуазеі яшчэ больш выгодна адцяняе кампартыю ў вачох рабочых.

МАРСЭЛЬ КАШЭН.

Парыж—вастрог Сантэ.

ЛЯСНЫЯ ШКОДНІКІ І МЕРАПРЫЁМСТВЫ ПА ЎКАМПЛЕКТАВАНЬНІ ЛЯСЬНІЦТВАЎ.

Магілеў. Зараз па акрузе адбываюцца рэвізіі лясьніцтваў. Ужо абрэвізавана большая палова іх. У працягу лета і восені рэвізійная праца будзе скончана.

Рэвізіі маюць мэтаю ўсебакова высьветліць працу і становішча лясьніцтваў: у галіне лясных распрацовак і водпуску лесу насельніцтву, леса-культуртэхнікі і аховы лесу, справаводзтва і грашовай справаздачнасьці.

Што выявілі рэвізіі?

Рэвізіі паказалі, што з асабовым складам лясьніцтваў ня ўсё добра. У шмат якіх лясьніцтвах сядзяць чужыя нам людзі, няма ў іх нашага савецкага вока. Кіраўнікі лясьніцтваў—лясьнічыя ня толькі вядуць працу „цераз пень калоду“, але і больш таго: выкрыты проста крымінальныя тыны. Вось яны:

Аўчыньнікаў, быўшы лясьнічы Ліцьвінаўскага лясьніцтва. Гэты Аўчыньнікаў, адводзячы лесасеку для Гомельскай канторы Лесбелу, ацаніў яе на 43 тысячы ніжэй супроць яе рэчавістай каштоўнасьці. Ён ня лічыў патрэбным і захоўваць розныя „фармальнасьці“ наконт водпуску лесу. Практыкаваў „сыстэму“ звычайных запісак:

— Адпусьціць такому-та (заможніку, альбо блізкай да Аўчыньнікава асобе) лесаматар'ял...

Сваю працу Аўчыньнікаў цаніў вельмі высока. Пры разьмеркаваньні прэміяльных—сабе самому выпісаў 900 рублёў, а свайму памоцніку—толькі 60 рублёў. Адзначыўся, акрамя таго, п'янствам і гульнёю ў карты.

Другі лясьнічы **Іваноўскі** з Язерскага лясьніцтва ўвайшоў у хаўрус з прыватнікам. Лясьніцтва склала дагавор на пастаўку 60 тысяч пар гужбы Лесбелу. Фактычна гэтую гужбу выробляла не лясьніцтва, а прыватнік Рабіновіч, якога Іваноўскі залічыў на „службу“ і выдаваў яму авансы Лесбелу. Звыш вакантраванай гужбы, Рабіновіч „вырабіў“ яшчэ сотню тысяч, прадаў яе таму-ж Лесбелу і грошы 8 тысяч рублёў паклаў у ўласную кішэню.

А вось і трэці—Чэрыкаўскі лясьнічы **Клокаў**, які растраціў 3 тысячы рублёў. Гэта—марфініст і какаініст. Калі яго арыштавалі, дык ён зараз-жа патрабаваў ад турэмнай адміністрацыі, каб яму безадкладна дэлі морфію, без якога ён жыць ня можа. Па яго словах, растрачаная сума пашла на гэтыя «лёкі» (у яго ўсе ногі і рукі—чорныя ад уколаў, ён да таго прызвычаіўся да наркоцікі, што і ў спраўдоме доктар дае яму два разы ў дзень нарко).

Тут-жа трэба адзначыць, што рэвізія выявіла і добра працуючыя лясьніцтвы. Вось лепшае ў акрузе лясьніцтва—Шклоўскае (лясьнічы т. Палякоў), яно здолела зусім добра ахапіць усе галіны працы.

Таксама зусім здавальняюча працуюць Дняпроўскае, Касьцюковіцкае і Цяхцінскае лясьніцтвы.

Выяўлены нядобраякасны склад працаўнікоў лясьніцтваў прымусіў зьвярнуць на гэты бок увагу.

За апошні год удалося на чале трох лясьніцтваў паставіць лесаводаў-партыйцаў.

Яшчэ ў тры лясьніцтвы падобраны тры надзейныя лясьнічыя.

Нарэшце, узят курс на высоўваньне на пасады лясьнічых нашых савецкіх маладых лесаводаў, пасьля таго, як адбудуць вядомы стаж практычнай працы і заляваць сябе здольнымі працаўнікамі. Гэтак ужо зараз працуюць, як лясьнічыя, пяць маладых спэцыялістаў, пераведзеныя на гэтую пасаду з памоцнікаў лясьнічых. **К. Л—кі.**

На Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

На пасевах лёну зьявіўся невядомы шкоднік.

Беларускі Сельска-Гаспадарчы Дасьледчы Інстытут імя Леніна на мінулым тыдні атрымаў з Віцебскай акругі тэлеграму аб тым, што на льняных палёх паявіўся ў вялікай колькасьці невядомы шкоднік, які зьядае пасевы.

Сельска-Гаспадарчы Інстытут зараз-жа камандураваў на месца 3 супрацоўнікаў-спэцыялістаў для барацьбы з гэтым шкоднікам. Зараз высьветлілася, што гэты шкоднік завецца «даўганогі капусны чарвяк», які дагэтуль паяўляўся вельмі рэдка і не ў вялікай колькасьці, а таму навукай дасьледаваны недастаткова і наша навука яшчэ ня ведае сродкаў барацьбы з гэтым шкоднікам.

Абсьледваньне ўскладняецца тым, што з-за дажджу чарвяк не паяўляецца з-пад зямлі і наогул ён выходзіць толькі ноччу.

Інстытут накіраваў у райёны, у якіх зьявіўся шкоднік, газы і асыгнаваў спэцыяльныя сродкі на барацьбу.

Такі-ж самы чарвяк замечаны на капусьце ў Грэцкім райёне Менскай акругі.

Барацьба з гэтым шкоднікам палягчаецца тым, што ў сучасны момант ён уступіў у пэрыяд размнажэньня і шукае спэцыяльнага месца, дзе-б класьці свае яйкі. Задача спэцыялістых знайсьці гэтыя месцы і зьнішчыць яйкі чарвяка.

Наогул, гэты выпадак вельмі рэдкі і выклікаў у навуковых колах вялікі інтарэс.

Зрыў дагаворнай кампаніі.

Магілеў, 19-VI. Калі кампанія па заключэньні дагавораў з батрацтвам праходзіць здавальняюча і наогул лепей, чымся ў мінулым годзе, дык зусім дрэнна стаіць справа па заключэньні дагавораў на **грамадзкіх пастухоў**. Вёскі адмаўляюцца, як правіла, ад выбару ўпаўнаважаных для заключэньня гэтых дагавораў.

Гэтак, па трох райёнах (Быхаўскім, Журавіцкім і Чачэвіцкім) заключаны дагаворы на грамадзкіх пастухоў толькі па аднаму (!) сельсавету ды яшчэ па Быхаўскаму гарсавету.

Каму дапамагае Барысаўская райземкамісія?

Пра **Добрыцкае** заўсёды гаворыць, як пра кулацкі засьценак. Тут, бязумоўна, ёсьць кулакі і як усюды сераднякі і беднякі. Але справа ў іншым.

У 1925 годзе беднота захацела абрэзаць зямлю ў кулакоў. Рацавалася вясковая беднота, што зажывуць яны палюдзку. Пастухі, батракі, падпаскі былі атрымалі ўжо пасьля суда права на вызначаную ім зямельку. Але чамусь канчаткова справа нейдзе зацёрлася. Беднота хадзіла, хадзіла па розных камісіях, падкамісіях ды нічога ня можа дабіцца. Няма ўжо і моцы. А нарэшце думае па тэй прыказцы: „З дужым не бярыся, а з багатым не цягніся».

Толькі трэба, каб іначай падумала добрыцкая беднота.

Але ці не падумае разам з ёю і Барысаўская райземкамісія, чаму з 1925 году яна дагэтуль ня можа абрэзаць зямлі ў кулакоў?

Б. Р.

Старшыні сельсаветаў—у дом адпачынку.

Гомель, 19-6. Акрвыканкомам закуплена 22 месцы ў доме адпачынку для старшынь сельсаветаў. Учора месцы былі разьмяркованы па райёнах.

Бандыты—да расстрэлу.

Гомель, 19-6. *Бандыт Паўла Мельнічук, які забіў рабочага чыгуначніка Кубліцкага 16 чэрвеня, засуджан акруговым судом да пакараньня сьмерцю.*

Справа слухалася ў клюбе пры вялікім прытоку рабочых, якія адобрылі прысуд.

Кансультацыя карыстаецца посьпехам.

Лагойск, 19-6. Шостага чэрвеня ў Лагойску адчынілася дзіцячая кансультацыя, якая абслугоўвае пораважна сельскае насельніцтва. Толькі за час з 7 до 13 чэрвеня кансультацыя прапусьціла 150 дзяцей. Працаўнікі кансультацыі наладжваюць часта высады ў вёскі. Наогул, кансультацыя карыстаецца аўтарытэтам насельніцтва і сялянае дапускаюць уладу за яе адчыненьне.

Здавальненьне сялян насеньнем.

БАБРУЙСК, 19-6. Аддзяленьне Цэнтраземскладу да 1 чэрвеня адпусьціла сялянству 4800 пудоў рознага насеньня. У сучасны момант для перасеву ёсьць запас насеньня ў тысячу пудоў.

Дапамога крэдытным таварыствам.

БАБРУЙСК, 19-6. Для падняцьця мыцьцяздольнасьці дэфіцытных крэдытных таварыстваў акруговы сельска-гаспадарчы банк вылучыў 24 тысячы рублёў. Грошы гэтыя будуць выдадзены Старобінскаму, Асіпавіцкаму, Слуцкаму, Стара-Рудянскаму і Сьвіслацкаму таварыствам.

На дапамогу вясковаму будаўніцтву.

БАБРУЙСК, 19-6. Прыймаючы пад увагу недахват цэглы для вясковага будаўніцтва, Бабруйскі Камунальны Трэст забіраіраваў 30 тысяч штук цэглы для патрэб сялянства.

СА СМАЛЕНСКУ ДА ХЭРСОНУ НА ЧАЎНЕ.

МАГІЛЕЎ, 19-6. Праз Магілеў праехалі тры камсамольцы-турысты, якія ладзяць экскурсію са Смаленску ў Хэрсон на звычайным чаўне. Мэта падарожжа—азнаямленьне з жыцьцём і працаю беларускага і украінскага сялянства і камсамольскіх арганізацый.

ТЫСЯЧА РУБЛЁЎ НА ДЗІЦЯЧЫЯ ПЛЯЦОЎКІ.

Гомель, 16-6. Саюз дрэваапрацоўнікаў выдаў 1.000 руб. для арганізацыі на прадпрыёмствах дзіцячых пляцовак.

Абсьледваньне Ўлукаўскага дзіцячага гарадка.

Гомель, 19-VI. Фінкантролем вроблена абсьледваньне Ўлукаўскага дзіцячага гарадка. Выяўлена, што дзіцячы гарадок не ў дастатковай меры выконвае свае абавязкі ў адносінах азнаямленьня выхаванцаў з сельскай гаспадаркай. У школе няма ніводнага агранома-настаўніка. Дзеці ня прыцягваюцца да працы па сельскай гаспадарцы, па якой прычыне не атрымоўваюць ніякай кваліфікацыі. Штат гарадку завялікі.

З прадпрыёмстваў, якія маюцца ў гарадку, працуе толькі цагельны завод, а пры правільнай пастаноўцы справы ўсе прадпрыёмствы павінны быць выкарыстаны.

Гаспадарка ў гарадку вядзецца нерэнтабельна. Пасевы робяцца не па пляну. Частка рынку не скарыстоўваецца для рэалізацыі розных гароднікіх прадуктаў.

Фінкантроль прапануе прыняць меры да палепшаньня арганізацыйнай працы, вывучыць магчымасьць пачатку працы вытворчых прадпрыёмстваў і зьнішчыць выкрытыя недахопы.

Лясны „сэпаратызм“.

Барысаў. Лясная гаспадарка ў нашым райёне знаходзіцца ў кепскіх умовах. Гэта тлумачыцца тым, што кіраўнікі дрэнна адносяцца да яе. Напрыклад: у Неманіцкім лясьніцтве, лясьнічы Цітавец не зьвярнуў належнай увагі на ачыстку лесу да таго часу, пакуль з НКЗБ ня прыехаў прадстаўнік і не праверыў пастаноўку працы ў адносінах ачысткі лесу. А ў красавіку м-цы на нарадах лясьнічых пры Барысаўскім РВК гэтыя пытаньні абгаварваліся. Лясьнічы Цітавец ня лічыў гэта сваім абавязкам і ня выконваў пастановы нарад да гэтага часу.

Трэба адзначыць, што з боку акр. інспэктарыяту лясоў зусім мала было зьвернута ўвагі пры абглядзе лясьніцтваў на сувязь з мясцовымі ўстановамі і арганізацыямі. Ніводзін з прадстаўнікоў інспэктарыяту лясоў ня зойдзе ў РВК дагаварыцца, як зьнішчыць шэрагі недахопаў у нашых лясьніцтвах.

А. С.

Дух Заглобы

з дамешкай гатэнтоцкай маралі.

Вядомы польскі пісьменьнік Г. Сянькевіч у сваім мастацкім творы «Агнём і мячом» даў клясычны жыцьцёвы тып польскага шляхціца Заглобы, якога заўсёды цягнула да зброі.

Тып Заглобы—гэта нацыянальны польскі тып, які жыў і будзе жыць сярод польскай шляхты, пакуль будзе жыць гэта шляхта.

Як тып, Заглоба цікавы, крыху сьмешны, але калі даць яму магчымасьць ажыцьцяўляць свае імкненьні, асабліва-ж падбухторваць—ён можа быць небясьпечным.

Разумная дзяржаўная палітыка павінна мець сваёй мэтай эканамічнае і культурнае разьвіцьцё дзяржавы.

У Польшчы зараз—гэта толькі сродкі. Мэтай сваей даяржаўнай палітыкі польская буржуазея і мяшчанства ставяць валяўнічыя пляны, якія павінны даць Польшчы „мацарствовэ становіско“ (вялікадзяржаўнае становішча).

Гэтай мэце падпарадкуецца цяпер у Польшчы ўсё.

Як - жа сабе ўяўляюць у Польшчы гэта «мацарствовэ становіско»?

А вось перш за ўсё—далучэньне Літвы, затым абшараў Савецкай Беларусі і калі ня ўсёй, дык значнай часткі Савецкай Украіны.

Аднак, памыліўся-б той, хто падумаў бы, што гэта ўсё.

Не—гэта толькі першыя этапы **„ажыцьцяўленьня тае вялікае ідзі, дзеля якой заклікана Польшча як падваліна цывілізацыі на Ўсходзе Эўропы“.**

Такая ўстаноўка заданьняў палітыкі Польшчы зьяўляецца ў самой Польшчы настолькі бясспрэчнай, што не патрабуе якіх - небудзь доказаў або тлумачэньняў.

Знадворнага боку гэта палітыка засланяецца для формы прарыстай заслонай з прамоў і інтэрв'ю дыплёматаў, інсьпіраваных артыкулаў і г. д.

Прарыстасьць гэтай заслоны дазваляе і нам бачыць валяўнічыя намеры і імпэрыялістычныя пляны Польшчы.

Для ілюстрацыі гэтых плянаў і панаваньня валяўнічага духу Заглобы зьвернемся да некаторых фактаў.

Валяўнічы дух Заглобы выяўляе сябе перад усім у непамерным выдаткаваньні дзяржаўных сродкаў на вайсковыя патрэбы і ў мілітарызацыі грамадзянскіх устаноў.

Зараз у польскім сойме ідзе абгаварэньне бюджэту на 1928-29 год. Выдаткі на армію складаюць у гэтым бюджэце 40 проц. Калі-ж прыняць пад увагу запанаваўшую ўжо на працягу гадоў традыцыю значных пазакаштарысных выдаткаў на армію і розныя замаскаваныя крэдыты на гэту-ж патрэбу, дык з поўнасьцю можна сказаць, што вайсковы бюджэт Польшчы складае ня менш як 50 проц. агульнага даяржаўнага бюджэту.

Ці-ж гэта ня дух Заглобы заахвочвае ўрады Польшчы да павялічэньня праз сілу і праз меру сваіх узброеных сіл коштам занядбаньня іншых галін гаспадарчага і культурнага жыцьця даяржавы?

Ці-ж не характэрным у гэтым сэнсе зьяўляецца зазначэньне дакладчыка вайсковага бюджэту ў сойме—Касьцялкоўскага, што вайскоры бюджэт у Польшчы гэта **«бюджэт прывілегіраваны»?**

Што там культурныя запатрабаваньні, ці эканамічнае становішча з хваляй забастовак, з узрастаючым занепадам прамысловасьці, з хранічнай насыўнасьцю гандлёвага балянсу! Усё гэта так сабе, між іншым, справы другарадныя.

А вось павялічэньне зброі, падрыхтоўка вялізных запасаў вайсковых матар'ялаў—гэта справа **„прывілегіраваная“**, перад якой усе іншыя запатрабаваньні павінны адыйсьці далёка назад.

Ці-ж не казаў вуснамі дэпутата Касьцялкоўскага ў даным выпадку стопроцантны Заглоба?

Бязумоўна, што толькі дух Заглобы мог выцісьнуць з палітычнага і грамадзкага жыцьця Польшчы шмат актуальных і балючых пытаньняў, накіраваўшы матар'яльныя і маральныя сілы да як мага большага павялічэньня зброі і армії.

Пытаньне—навошта гэткая вялізная колькасьць зброі і супроць каго яна мае быць накіравана,—у Польшы не паўстае, настолькі там гэта пытаньне яснае і зразумелае.

Ня менш, прынамсі, яно зразумела і для нас, але для поўнасьці возьмем некалькі больш яскравых прыкладаў з апошніх дзён.

У часе агульнай дыскусіі ў сойме аб бюджэце выступіў дэпутат сойму Д. Лявіцкі—член украінскай згодніцкай партыі УНДО *). Гэты Лявіцкі на працягу доўгага часу кідаў пяруны і маланкі ў бок СССР,—асабліва-ж Савецкай Украіны. Лявіцкі разгарнуў перад соймавымі Заглобамі шырокую пэрспэктыву захопу Савецкай Украіны і ўтварэньня буржуазнай украінскай даяржавы ў сьціслай, зразумелай «фэдэрацыйнай» еднасьці з Польшчай.

*) Украінскае Народна - Дэмакратычнае Аб'яднаньне.

Або вось яшчэ адзін прыклад.

На старонках польскага паўафіцыёзу «Глос Праўды» адзін з адказных супрацоўнікаў міністэрства замежных спраў, пад пэўдонімам „Спэктатар“, зьмясьціў шэраг „праграмных“ артыкулаў аб ненармальным палітычным становішчы Эўропы наогул і аб сродках, якія маглі-б паправіць гэта становішча. Можна з упэўненасьцю зазначыць, што зьмест гэтых артыкулаў перад іх надрукаваньнем быў больш чым вядомы міністру замежных спраў Польшчы Залескаму.

У артыкулах сваіх „Спэктатар“ выразна зазначае, што **сыстэма, якую ўстанавіў взарсальскі трактат, ня мае лёгічнай закончанасьці, паколькі засталося неўрэгуляваным „расейскае пытаньне“**, і што толькі **„памыснае скончэньне кіеўскага паходу маршала Пілсудзкага магло-б быць адной з самых верных гарантый моцнасьці эўрапейскага ладу, які быў скансструіраваны ў Взарсалі“.**

Іншымі словамі: дзеля ўзмацненьня „взарсальскага“ ладу ў Эўропе неабходна ўзброенае выступленьне супроць СССР—паход на Кіеў і захоп тэрыторыі Савецкіх Рэспублік.

Як можна бачыць з паданых прыкладаў, выступленьне «украінца» Лявіцкага ў сойме і «тэзісы» Спэктатара зусім зьвязаны і пагоджаны.

Вельмі цікавы характэрны таксама яшчэ адзін прыклад выяўленьня польскай буржуазейй Заглобінскага валяўнічага духу.

Справа ідзе аб „сымболічным“ сьвяткаваньні польскімі абшарнікамі, урадоўцамі і ксяндзамі **з прычыны ўстанаўленьня „гэоэтрычнага цэнтру,—асяродку польскіх абшараў“.**

Польская віленская газэта „Слово“—орган польскіх манархістаў—у № 120 за 27 мая паведамляе аб прычынах гэтага сьвята наступнае. Нейкі абшарнік граф Грабоўскі, уласьнік маёнтку „Грашуўка“, у ваколіцы Баранавіч Навагрудзкага ваяводзтва наладзіў 21 мая г. г. у сваім маёнтку сьвяткаваньне з прычыны адчыненьня табліцы дзеля ўшанаваньня памяці свайго дваюраднага прадзеда (!) нейкага Тадэуша Рэйтана. Гэты Рэйтан нарадзіўся ў 1742 годзе, жыў у „Грашуўцах“ і памёр у 1780 годзе.

Кожны можа шанаваць памяць сваіх продкаў, хоць-бы і дваюрадных, як хоча і калі хоча. Калі на дату 21 мая 1928 г. не прыпадае ніякага акрэсьленага юбілейнага пэрыяду ні ад нараджэньня ні ад сьмерці Рэйтана, але патомкам яго ўсё-ж ткі захацелася ўшанаваць яго памяць, дык гэта прыватная справа таксама яго патомкаў.

Але цікава, як гэтаму фамільнаму сьвяту здолелі надаць палітычны характар. А зрабілася гэта вось як: на табліцы зазначана, што яна адчынена „ў 7-ю гадавіну ратыфікацыі Рыскага трактату, які, дарачы кажучы, ня мае да нябожчыка ніякага дачыненьня. Але гэта яшчэ ня ўсё. Цэнтр цяжару на гэтай урачыстасьці быў у прамовах, ксяндзоўскіх малітвах і артыкулах польскай прэсы. Аказваецца, што ўся паслуга Рэйтана і прычына ўшанаваньня яго памяці—у тым, што ён жыў і памёр **«у гэоэтрычным цэнтры—асяродку польскіх зямель».**

Такім чынам, рэйтанаўская ўрачыстасьць у «Грашуўцы»—гэта ня прыватная ўрачыстасьць, а палітычная дэманстрацыя захопніцкіх апэтытаў Польшчы на тэрыторыю СССР.

Апэтыт, як відаць, вялізарны.

Калі „пупам“ Польшчы лічыцца мясцовасьць каля савецка-польскай мяжы, дык тэрыторыі СССР, амаль што роўную ўсёй тэрыторыі сучаснай Польшчы.

На гэтай дэманстрацыі тэрытарыяльных апэтытаў польскай буржуазеі прысутнічаў афіцыйны прадстаўнік улады, навагрудзкі ваявода, які меў «ад

Праверка--самакрытыка--кантроль мас

„Дасылайце заказы дзеля зрабленьня“.

Якіх толькі на сьвеце няма прадпрыемстваў? Я чуў, што недзе ў далёкім Растове было прадпрыемства па выробу кухняў. Гэтае растоўскае, нечакана яму памяць, прадпрыемства надзвычайна лоўка сабе рэклямавала.

Чытаем, бывала ў «Праве» ці «Известиях» прыгожую паўстранічную вестку:

«КУХНЯ ДЛЯ ВСЕХ. Женатым, замужним, холостякам и девицам рекомендуем купить небывалую новинку-кухню самоварку—только за 5 руб. Купившій кухню самоварку имеет: чугунную печку с необходимым запасом топлива, большое количество кухонной посуды, чайный сервиз, и разные другие приспособленности».

Так прадпрыемства сабе рэклямавала. Калі рэкляма знаходзіла вартых сабе ахвяр, дык паложаным плацяжом атрымлівалі кацялок, ложачку і кубак з чорнай бляхі, якую ў нас на Беларусі звычайна ўжываюць для страх то толькі пафарбаваўшы. Праз паўгода пасьля раклямы прадпрыемства ведала куды дзесь 5-цірублёўкі.

Аднак, ня кожнае прадпрыемства можа так лоўка нажыць грошы. На жаль выдумкі нашы беларусы зусім не здольны. Мы, беларусы, рэклямаваць сабе ня ўмеем. Рэкляма наша нікудышняя, а заказы мы выконваем заўсёды добра. Возьмем для прыкладу рагачоўскую друкарню. Яна вось як сябе рэклямуе:

„Паведамляем вас, бачыце як сяроме. СЁМА), што наша друкарня знаходзілася раней пад загад Бабруйскага Акруговага Камунальнага Трэсту у сучасны момант згодна пастановы прэзыдыуму Акруговага Выканаўчага Камітэту перайшла да Рагачоўскага раённага Выканаўчага Камітэту. Друкарня тэхнічна добра абсталявана з БАЛЬШЫМ асартымэнтам шрыфтоў і падобранай кваліфікованай сылай, БЯРЭ УСЯЛЯКАГА РОДУ ЗАКАЗАЎ друкарскай працы. Просьба заказы друкарскай працы якія маюцца ў вас пасылаць к нам дзеля ЗРАБЛЕНЬНЯ.

У чаканьні вашых заказаў прабываем:
ДРУКАРНЯ РАЙВЫКАНКОМА“.

Бачыце, як мы—беларусы скромна сябе рэклямуем. Прачытаўшы рэкляму, можна падумаць, што заказаў друкарня ня мае і мець ня можа, бо вельмі ўжо рэкляма недарочная як па форме, так і па зьместу і асабліва з боку беларускай пісьменнасьці.

Здаецца, які ідыёт можа даць гэтай друкарні заказ, калі гэты штампованы ліст разсылаецца па ўстановах Беларусі ў такой агіднай апрацоўцы. Але гэта толькі здаецца так. «Рагачоўская» друкарня мае шмат заказаў. Чым яна бярэ, як кажуць, сваё—невядома, але бярэ, бо на гэтым штампаваным лісьце таксама надрукавана:

„Друкарня выробляе кнігі, брашуры, справаздачы, бланкі і інш.“

Вось з гэтага, аказваецца, друкарня і жыве. Нічога яна не надрукуе, бо ня ўмее—гэта відаць з рэклямы. Друкарня, толькі выробляе кнігі, брашуры, бланкі...

Калі ўсе друкарні пяройдуць на выраб кніг і брашур, дык што тады будуць рабіць пісьменьнікі ды перапляётчыкі?

Эх, Рагачоўская друкарня... Вам трэба гэты ліст абавязкова скасаваць і нікуды яго не пасылаць, бо, хаця вы і абсталяваны з „бальшым“ асартымэнтам шрыфтоў, але заказаў для „зрабленьня“ вам ніхто ня дасьць.

Сёма.

Аб безгаспадарчасьці, злачынных адносінах да дзяржм. маемасьці, бюракратызьме, галавацяпстве.

(Завод «Чырвоны Кастрычнік» Аршанская акруга).

На мясцох яшчэ трэба нямала правесьці працы ў барацьбе з бюракратызмам, галавацяпствам, безгаспадарчасьцю і да таго падобным злам.

Вось вам прыклад—бяру адміністрацыю заводу «Чырвоны Кастрычнік»—былы калісь «Барань». Загадчык на заводзе Красноў. Бываюць такія выпадкі, што прыдзе да загадчыка рабочы прасіць каня адвесьці хворага ў гор. Воршу—3 вярсты; просіць, кленчыць, канькае. І як вы думаеце—заг. т. Краснoў дасьць?—Відома не. Ня хоча «баланаваць» рабочых. А жонку сваю дык зусім не даглядае, што яна хоць кожны дзень едзе ў Воршу паглядзець спэктакль, кіно-карціну і г. д.

Калі таму ці іншаму рабочаму трэба атрымаць 3 рублі грошай, зароблены, і загадчыку пакажацца гэта «падазрыцельным», дык ён паваляводзіць справу некалькі месяцаў, зьсьвядціць у суд пару разоў і тады ўжо выдасьць. Быў такі выпадак, што завком прапанаваў адміністрацыі на чале з т. Красновым прысутнічаць на вытворчай агульназавадзкой нарадзе, дык ён адмовіўся і паехаў у г. Віцебск да крэўных жонкі ў госьці.

Ёсьць таксама на заводзе яшчэ адзін вялізны галавацяп-бюракрат, загадчык складу т. Чапонец. Рабочыя абураны яго дзейнасьцю і працай і зьбіраюцца вывезьці на тачцы за вароты з заводу. Ён груба абыходзіцца з рабочымі, ганяе за струмантамі па некалькі разоў, а таксама немалую валакіту ўтварае пры выдачы спэцвопраткі.

Цікавае 20 проц. скарачэньне адміністр.-гаспадарчых выдаткаў адбылося на заводзе. Замест выдаткаў—пачалі са штату служачых, і тут нічога ня вышла. Што-ж мы бачым пасьля скарачэньня адм.-гасп. выдаткаў у працы бухгалтэрыі? Там сядзяць два новых бухгальтары і адзін з іх, як кажа т. Красноў, працуе не за нашы сродкі, а за сродкі якогась ліквідкому. Як па вашаму абстаіць справа з бухгальтэрыяй пры наліччы двух бухгальтараў? Вельмі дрэнна: даклады нядзік, калькуляцыю і ўсё іншае можна атрымаць прыблізна праз паўгода.

Вось ужо праляцела палова самага спрыяючага будаўніцтву сэзону, а заводакіраўніцтва не падумала аб тым, што трэба рабіць рамонт кватэр рабочых. Шмат ёсьць кватэр небясьпечных для жыцьця. Кожны дзень пагражае абваліцца столь, рухнуць печ і праваліцца падлога. Але што ім да гэтага, яны спакойна будуюць новенькі дом для інжынэра Адамовіча, а з рабочых бяруць грошы за кватэры.

Пару слоў аб ахове працы рабочых.

У сёлетнім годзе на ахову працы рабочых адпушчана 16.500 руб., але да гэтага часу ў гэтай галіне нічога ня зроблена. Адміністрацыя трэсту на гэта не зварочвае ўвагі, а інжынэр Адамовіч раз нешта на вытворчай нарадзе бракнуў, што з гэтай сумы грошай палова будзе выкарыстана на абсталяваньне аціпленьня ў новым цэху.

Завод выробляе нікому непатрэбныя рэчы.

Два гады падрад (1925-1926) завод выробляў досыць добрай якасьці сячкарні і патроху зарабляў на іх. Сяляне купілі іх і хвалілі. А зараз чамусьці бачым адваротнае: ёсьць зробленых каля 300 штук сячкарняў, якіх ніхто ня хоча купляць і яны ляжаць на складзе заводу—пад вучотам мёртвага капіталу. Некаторыя часткі ад іх пачынаюць памаленьку зьнікаць са складу.

Таксама не ўдалася адміністрацыі заводу сумесна з адміністрацыяй Белмэталтрэсту справа з абсталяваньнем вухнальнага цэху (падковачныя цьвікі), на якім яны думалі добра зарабіць. Зараз мы маем такое становішча з вухнальным цэхам. У 1927 г. ён цэлы год працаваў, выраблена каля 1500 скрынак вухналёў, але збыць іх не ўдалося, бо мусіць якасьць іх ня зусім добрая. Зараз цэх зачынен. На абсталяваньне яго затрачана некалькі 10 тысяч руб. і зараз прышлося зачыніць—ня вельмі прыемная рэч.

Кожны ў двары заводу можа ўбачыць поўную безгаспадарчасьць: параскіданы дзе папала і як папала часткі машын, жалеза, чыгун; на гэта ніхто не зварачвае ўвагі.

Адміністрацыя зусім ня лічыцца з вопытам рабочых. У мінулым годзе абсталёўваўся токсавы цэх (дробных цьвічкоў). Адміністрацыя не падумала зьвярнуцца да рабочых і параіцца наконт таго ці іншага пытаньня.

У ліпені м-цы рабочыя на вытворчай нарадзе пастанавілі пабудаваць кузьню каля драцянага цэху з тэй мэтай, каб ня бегаць за цэлыя гоні правіць струмант. Але шмат прабегла часу і кузьня яшчэ не пабудавана; прычына ўсяму гэтаму—няма падумавала і яшчэ чагосьці.

Вось як адміністрацыя кіруе заводам, павышае вытворчасьць, зьнішчае бюракратызм, валакіту і безгаспадарчасьць. Шмат віны за такую неразьбярыху кладзецца і на парт'ячэйку і на камсамольскі калектыў за няўдбайства і адсутнасьць уплыву на адміністрацыю.

С—лаў.

Сто тысяч, ды яшчэ з гакам.

Яшчэ ў леташнім годзе мы цікавіліся шырокім размахам рамонтных работ у Доме Працы. На запытаньне—колькі будуць каштаваць рамонтныя работы, быў адказ—«свыше 100.000 р.». Тады гэта выглядала добра. Тады яна было зразумела, бо размах рамонтных работ быў сапраўды ня менш, як сто тысячны. Усе цэнтральныя праўленьні саюзаў Беларусі былі з Дому Працы выселены на клюбах і іншых памяшканьнях, а ў Доме працы запаслаў грукат малаткоў і сякер, скрыгот заржавелых цьвікоў, цэлыя хмары пылу з разваленых печаў і дымаходаў.

Так было амаль паўтара гады.

Восьменьню мінулага году мы ўбачылі першыя вынікі ўпартай працы па адпачынкавым дому. Пры ўваходзе з другі паверх адчувалася, што гэта сапраўды Беларускі Дом Працы. Адзінае афарбаваньне падлогі, цёмнаабры карніза на сьценах, абшляг над «залі» слуцкі пояс—усё гэта дыхала прыгожасьцю, скромнасьцю і непадробленай пекнатою.

Час ішоў. Сёньня мы маем 19 чэрвеня году 1928.

Увайшоўшы ў Дом Працы з пляцу Свабоды, адразу захапляемся прыгожасьцю. Колькі некалькі дзён таму назад дапаможаны і пафарбаваны дзьверы, пакрыты лякам чыгунныя пліты сходаў. Прыгожа і прыемна.

Усё гэта ўбачыць кожны, хто зайдзе ў Дом Працы.

Цяпер пра тое, што ня кожны можа бачыць.

Гэтымі днямі палякіраваныя пліты сходаў, «увы», ужо аблезьлі і зусім ня прыгожа нагадваюць аб нядаўнім мінулым, якое было ў часе рамонту Дому Працы.

Падняўшыся на першы паверх і ўвайшоўшы, напрыклад, у адно з памяшканьняў друкарні, ня трудна ўбачыць сьляды толькі што папсаванага на столі тынку. Усе гэтыя дзіркі ўжо шчыльна замазаны людзьмі, якія прымушаны былі зрабіць рамонт, нядаўна зробленага рамонту

Тут яшчэ нічога. Ну што-ж тут дзіўнага? Абваліўся тынк, дзіркі замазалі, пабялілі і зноў добра. А вось што думае рабіць ЦСПСБ з 2-ім паверхам,—трудна сабе ўявіць. Тынк тут ня ўсюды абваліўся, толькі патрэскаў. А вось падлога... Падлога тут зрабілася такая, што ня больш, як праз год неабходна будзе рабіць рамонт слаўнага стотысячнага рамонту. Праз шчыліны новых дзьвярэй можна сабак ганяць.

Хто ведае,—ці ўсё гэта? Усяго ў такім вялікім доме ня ўбачыш.

Каб усё ўбачыць, дык неабходна арганізаваць камісію з інспэктарам РСІ на чале. Камісія ўбачыць усё.

Цяпер, пасьля другога году рамонтных работ, пытаемся—колькі-ж вам каштаваў гэты «прыгожы рамонцік».

Адказ:—«Свыше 100.000 рублей».

Адным словам, сто тысяч рублёў, ды яшчэ з гакам. Колькі-ж рублёў у гэтым гаку? Ці ня другія сто тысяч? Хаця для такога «рамонту» даволі і ста тысяч, каб папасьці над спэцыяльную камісію РСІ, але трэба ўсё-ж такі высьветліць і велічыню гаку. Нешта вельмі ўжо рупліва гэты гак трымаецца ў сакроце.

Улас.

ЖАКТ № 3 „рамантуе“.

ЖАКТ № 3 распачаў рамонт сваіх будынкаў. Пашанцуе ЖАКТ'у, калі гэтары абмяжоўцца без ахвяр. Уявіце сабе забураны дах на 2-хпавярховым доме (Энгельса 7) з панакіданаю, нічым не прымацаваною бляхаю пры гэткім ветры, як учора ў ўсе апошнія дні. Да таго-ж праход на вуліцу і панадворку нічым не загарожан. Вецер гуляе з бляшанымі аркушамі, і з напорам і яму не забароніш шыбануць гэтую бляхаю каму-небудзь у галаву, таксама, як не забароніш ЖАКТ'у карміць гэтарантаў абіцанкамі ды заўтракамі з шампанам.

І трэба-ж было яшчэ на гэты разбураны дах „неспадзявана“ паліць дажджу пры гэткім „добрым, цёплым, летнім“ надвор'і!

Ну, і дурны-ж дождж, хіба-ж ён ня ведае, што ня можна паліваць на разбураны дах праз столь ды на пасьцель кватарантам?

Што ЖАКТ і майстры гэтага ня ведаюць, дык мы ўжо ўпэўніліся, гэтыя, як «заданоленыя» жыхары палошчуцца ва ўласнай кватэры, нібы ў лазьні.

Вось бы папаласкаць гэтак каго належыць, а тады за вушка да на сонейка!

Ня шкодзіла б!

Не рамантуюць, а руйнуюць. Сьведка.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦВК БССР.

14 чэрвеня 1928 г. пад старшынствам тав. А. Г. Чарвякова адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК. Разам з іншымі разгледжаны наступныя пытаньні:

ПРАВЕДЗЕНЬНЯ МЕРАПРЫ�ЁМСТВЫ Ў ВЫКАНАНЬНЕ ПАСТАНОВЫ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК—АБ ВЫНІКАХ ЗЬЕЗДАЎ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК.

Заслуханы даклады НК Асьветы, НК Аховы Здароўя і НК Земляробства аб праведзеных мерапрыёмствах у выкананьне пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР ад 22-XII-27 г.—аб выніках зьездаў работніц і сялянак.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў прыняць даклады да ведама. Усім наркаматам і акрвыканкомам прапанована паставіць у парадак дню пытаньне аб практычным выдзейнічаньні пастаноў прэзыдыуму ЦВК СССР і Прэзыдыуму ЦВК БССР аб працы сярод жанчын, распрацаваць адпаведныя пляны і сачыць за іх выкананьнем.

Аргаддзелу даручана падрыхтаваць даклад аб выніках і далейшых пэрспэктывах працы сярод жанчын, высьветліўшы ў дакладзе маючыяся дасягненьні за летні пэрыяд.

Гэты даклад Аргаддзелу будзе заслухан на пасяджэньні Прэзыдыуму ЦВК у кастрычніку месяцы г.г.

ВЫНІКІ РЭАЛІЗАЦЫІ Ў БССР ПАЗЫКІ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

Заслухан даклад члена Цэнтральнай Камісіі садзейнічаньня рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі—тав. Гальперына аб выніках правядзеньня гэтай кампаніі ў БССР.

Усяго ў БССР на 15-ае мая г.г. рэалізавана пазыкі на суму 2.386.435 рублёў, з якіх у сельскіх мясцовасьцях—77,9 проц., сярод вайсковых часьцей—15,7 проц., і ў горадзе—6,4 проц. Процантнае выкананьне кантрольнай сумы ў сярэднім па БССР складае—108,5 проц. Лепш выканаўшымі кантрольныя лічбы зьяўляюцца акругі Мазырская, Бабруйская і Полацкая, горш Магілёўская і Гомельская. Аблігацыі пазыкі купляліся ўсімі коламі насельніцтва, галоўнай масай трымацеляў аблігацый зьяўляюцца бяднацкая і серадняцкая групы. Беднота часта набывала пазыку за апошнія грошы. Былі выпадкі, калі сяляне, зароблены імі за вывазку лесу грошы, цалкам аддавалі на аблігацыі (вёска Ямная, Быхаўскага райёну, Магілёўскае акругі).

Наогул, трэба адзначыць, што адносіны сялянства да пазыкі спрыяючыя, за выключэньнем асобных кулацкіх выступленьняў супроць пазыкі.

Вытвараныя ў г.г. Бабруйску і Мазыры тыражы пазыкі прыцягнулі ўвагу шырокіх колаў насельніцтва ў асаблівасьці сялянства. Прадстаўнікі ад сялян трымацеляў аблігацый, якія ўваходзілі ў склад тыражных камісій, актыўна ўдзельнічалі ў працы, знаёміліся з тэхнікай тыражу і такім чынам упэўніліся ў тым, што савецкая дзяржава адкрыта і справядліва выконвае ўзятыя на сябе абавязкі па дзяржаўных пазыках.

Прэзыдыум ЦВК на дакладу адзначыў, што агітацыйная праца, прысьвечаная кампаніі распаўсюджваньня пазыкі, прыняла характар масавай работы сярод сялянства, накіраванай на прасоўваньне ідэі дзяржкредыту ў глыбіню вёскі. Прымаючы пад увагу, што з агульнае сумы рэалізацыі пазыкі—на рэалізацыю ў сельскіх мясцовасьцях прыходзіцца 1860000 руб., што складае 2 р. 33 к. у сярэднім на адну сялянскую гаспадарку, лічыць, што гэтая лічба параўнальна нязначная і сьведчыць аб тым, што свабодныя грашовыя сродкі сялянства недастаткова, шляхам пазыкі, уцягнуты ў сацыялістычнае будаўніцтва краіны.

Акрвыканкомам прапанавана мець нагляд за свачасовым і правільным скарыстаньнем райвыканкомамі 10 проц. адлічэньняў ад пазыкі ў райённы бюджэт.

ПАСТАНОВА ПА ДАКЛАДУ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ СЯЛЯНСКІХ ТАВАРЫСТВАЎ УЗАЕМАДАПАМОГІ.

Зацьверджана пастанова па дакладу Цэнтральнага Камітэту Сялянскіх таварыстваў Узаемадапамогі. Прэзыдыум ЦВК, адзначыўшы ў гэтай пастанове ўсе станоўчыя і адмоўныя бакі ў працы таварыстваў узаемадапамогі, пастанавіў даручыць ЦК сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі, акруговым і райённым выканаўчым камітэтам, а таксама і сельскім саветам правесьці ў жыцьцё шэраг мерапрыёмстваў, у тым ліку:

Акрвыканкомам заслухаць даклады акруговых упаўнаважаных сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі і зрабіць неабходныя захады для палепшаньня працы камітэтаў на мясцох. ЦК сялянскіх таварыстваў пры распрацоўцы тэзісаў да дакладу на Сэсіі ЦВК улічыць тыя мерапрыёмствы, якія будуць прыняты акрвыканкомамі на падставе гэтай пастановы; райвыканкомам і сельсаветам узмацніць кіраўніцтва і практычную дапамогу таварыствам узаемадапамогі; таварыствам узаемадапамогі шырэй разгарнуць працу ў напрамку працоўна-грамадзкай дапамогі вясковай беднаце, сем'ям чырвонаармейцаў, інвалідам вайны, чырвоным партызанам і адзіночкам-жанчынам бядняцкім, а таксама ў напрамку прадстаўленьня ўсіх законных льгот; сялянскім таварыствам узаемадапамогі аказваць усебаковую дапамогу бядняцкім дзецям школьнага ўзросту ў напрамку пасылкі іх у школы, забясьпечаньня навучальнымі падручнікамі, прыладамі, адзеньнем.

АБ МЕРАПРЫЁМСТВАХ ПА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНІ МАСАВАЙ ПРАЦЫ САВЕТАЎ І САВЕЦКАЙ ДЭМАКРАТЫІ.

Прэзыдыум ЦВК, дзеля палепшаньня масавай працы саветаў і выканкомаў, пастанавіў правесьці ў жыцьцё шэраг мерапрыёмстваў, у тым ліку:

Даручыць Аргаддзелу ў тэрміновым парадку распрацаваць канкрэтныя даручэньні акруговым і райённым выканаўчым камітэтам аб мэтадах і формах палепшаньня масавай працы саветаў, павялічэньня ўдзелу батрацкага, бядняцкага і серадняцкага актыву ў гэтай працы і ўзмацненьня кіраўніцтва ёю; дзеля выяўленьня становішча працы сэкцый і камісій, як галоўных форм актывізацыі працоўных, Аргаддзелу падрыхтаваць пытаньне аб правядзеньні конкурсу на лепшую сэкцыю і камісію з такім разьлікам, каб конкурс быў распачат не пазьней 1-га кастрычніка; Аргаддзелу і Цэнтральнай Выбарчай Камісіі безадкладна распачаць падрыхтоўчую працу да чарговых перавыбараў саветаў, апрача гэтага, Аргаддзелу да пачатку фактычнай працы па перавыбарах падрыхтаваць скліканьне нарады па пытаньнях арганізацыйна-масавай працы саветаў і выканкомаў з удзелам працаўнікоў месц; Аргаддзелу сумесна з рэдакцыяй газэты «Савецкая Беларусь» арганізаваць выданьне ў газэце «Савецкая Беларусь» пэрыядычнага дадатку пад назвай „Праца Саветаў Беларусі“.

ПРА ЎЗАЕМААДНОСІНЫ РЭСПУБЛІКАНСКІХ І МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ УЛАДЫ З КААПЭРАЦЫЯЙ.

Зацьверджана пастанова ЦВК і СНК БССР пра ўзаемаадносіны рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады з каапэрацыяй і пра адказнасьць гэтых органаў за страты каапэрацыі ад іх незаконных загадаў каапэрацыйным арганізацыям.

Згодна гэтай пастановы, забараняецца ўсім ведамствам і мясцовым органам улады загадваць каапэрацыі рабіць выдаткі, непрадугледжаныя законамі, даваць заданьні, непрадугледжаныя плянамі яе дзейнасьці, загадваць каапэрацыйным органам уваходзіць членамі ў іншыя арганізацыі і ўкладваць у гэтыя арганізацыі сродкі. Неўпаўнаважаным на гэта органам улады забараняецца ўсялякае ўмешваньне ў працы каапэрацыйных органаў. Службовыя асобы, якія вінаваты ў парушэньні гэтай пастановы, адказваюць у крымінальным парадку.

Пірэвіцкія псыхапаты.

Кіраўнікамі Пірэвіцкай дзіцячай калёніі (Жлобінскі р., Бабруйшчына) не да дзяцей. Ім не да твару займацца правільным выхоўваньнем дзяцей калёніі. Яны глядзяць на гэта прымітыўна: «гарбатага—магіла справіць». „Якім чалавек нарадзіўся, такім і памры“. Вось пагэтаму адным з мэтадаў выхаваньня дзяцей калёніі зьяўляецца крык, грубасьць, нават мардабой, што практыкуе сам загадчык калёніі грам. Бардзінскі. Па яго думцы ў калёнію сабралася не дзетвара, а нейкі злачынна-цяжка выхоўваемы элемэнт. У яго амаль што палова дзяцей «тупыя», а шасьцёра нават «дэфэктыўныя».

У чым-жа праяўляецца дэфэктыўнасьць гэтых дзяцей. У іх адсталасьці, маласьвядомасьці. І вынікі—выхавацелі калёніі заместа вышукваньня мэтадаў выхаваньня дзяцей пачынаюць абзываць дзяцей (усякага, хто не па іхняму што зробіць) «псыхапат», «дэфэктыўны». Гэта паралізуе канчаткова дзіцячую ініцыятыву. Словы псыхапат і дэфэктыўны ўеліся ў плоць і ў кроў калёніі. Іх перанялі ад сваіх выхавацеляў ужо дзеці і строяць жарты адзін з другога.

Заместа наладжваньня цеснага калектыўнага жыцьця сярод дзяцей калёніі, выхавацелі і кіраўнікі калёніі (Бардзінскі і Мехаў) самі зьяўляюцца ініцыятарамі варожасьці сярод дзяцей. Дзеці, у выніку іх уплыву, разьбіліся на два лагеры: адны за Мехава, другія—за Бардзінскага.

Праца ў калёніі ператварылася ў нешта агіднае, карнае. Працаваць па гаспадарцы выхаванцы пасылаюцца ў якасьці кары за злачынствы.

Выхаваўчыя здольнасьці гр. Бардзінскага даходзяць падчас да апошняга. Выхаванца Невядомскага ён ударыў па галаве, Пігулеўскаму «засьвяціў» па твары, у Маскалева шпурнуў гамашам, Розеву засхаў далонью. Такія яго „мэтады“ дзіцячага выхаваньня.

Выхавалець Мехаў ня мае ніякай педагагічнай падрыхтоўкі, груба адносіцца да дзяцей, лаецца. Выхаваўчая праца культае на абедзьве нагі, дзеці аддадзены самім сабе, самаарганізацыя дзяцей таксама кепска наладжана. Ды і хто тут будзе займацца гэтым, калі выхавалець сам ня мае ніякага імкненьня да гэтага і працуе ён толькі (гаворыць з гонарам сам) «па заданьні партыі».

«Вайсковай» працай тут займаецца выхавацельніца Бардзінская, седзючы па вакне на другім паверсе, яна лоўка камандуе дзецям: «на абед у сталовую шагам марш»!

Побач з гэтымі хваробнымі зьявішчамі выхаваўчы пэрсанал калёніі не стараецца заняцца пытаньнем выпрацоўкі мэтадаў працы. А між тым тутжа знаходзіцца школа—7-мігодка і глеба для гэтага ёсьць.

У чым-жа справа? Справа, вядома, у тым, што пірэвіцкім выхавацелям няма часу займацца выхаваньнем дзяцей і вышукваньнем форм гэтай працы. «Дзяржымордаўскае» выхаваньне для іх прыемней і лягчэй. Ня дзіўна зусім, калі адзін з выхавацеляў гэтай калёніі заявіў, што яны ня могуць змагацца з уплывам вуліцы на дзяцей.

Пры такім выхаваньні нам уплыву вуліцы не перамагчы. Пірэвіцкая дзіцячая калёнія патрабуе аздараўленьня ад «дзяржымордаўскага» выхаваньня. Чым хутчэй гэта аздараўленьне будзе зроблена, тым гэта будзе карысьней для справы.

А. Дамброўскі.

БЕЛАРУСКАЯ КІНО-ФАБРЫКА.

(Гутарка з дырэктарам Беларускай кіно-фабрыкі ў Ленінградзе тав. М. Л. Крэсіным).

Дырэктар Беларускай кіно-фабрыкі ў Ленінградзе тав. МІХАСЬ ЛЯОНЦЯВІЧ КРЭСІН зьяўляецца аўтарытэтнаю асобаю ў кіно-сьвеце. Прыводзім з водзыву тав. Луначарскага весткі аб працы т. Крэсіна ў розных кіно-арганізацыях.

«Тав. Крэсін пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі быў назначан загадчыкам кіно-пададдзелу пазашкольнага аддзелу НК Асьветы.

У 1918 годзе—камісарам Скобелеўскага камітэту. У 1920—загадчыкам арганізацыйна-інструктарскім аддзелам, а пасьля кіраўніком „Госпрката“.

У 1921-23 гадох часова выконваў абавязкі дырэктара „Севзапкино“. З 1923 да 1925 году—дырэктарам „Кіно-Севера“. У 1925-26 годзе намесьнікам дырэктара вытворчасьці „Госкино“ і дырэктарам 3-й Дзяржаўнай кіно-фабрыкі».

Беларуская кіно-фабрыка ў Ленінградзе абсталявана даволі добра. Фабрыка зможа з посьпехам выкарыстаць усю вялізарную кіно-культуру ў Ленінградзе, яе тэхнічныя, мастацкія, рэквізытныя, мэблевыя і іншыя магчымасьці.

Усе гэтыя меркаваньні аказаліся, бязумоўна, правільнымі. Фабрыка Белдзяржкіно ўжо заявавала сабе аўтарытэт і вядомасьць: да фабрыкі зьвяртаюцца другія кіно-арганізацыі з просьбаю здаць ім у арэнду частку нашых кіно-атэльле.

Зразумела, асноўнай нашай мэтай і ўстаноўкай зьяўляецца ўтварэньне беларускай карціны. Гэта відаць з вытворчай праграмы, дзе з 6 карцін—5 выключна на беларускія тэмы і на беларускім матар'яле. Напрыклад, «Пеўні пераклікаюцца» фатаграфуецца з натуры ў савецкай гаспадарцы Бешанковічы каля Віцебску.

Сёлета мы мяркуем выпусьціць 6 карцін. Магутнасьць фабрыкі такая, што калі матар'яльныя прадпасылкі будуць моцныя, дык мы зможам павялічыць сваю вытворчасьць, і на другі год выпусьціць 10, а на трэці—15 карцін.

Рамонт і абсталяваньне фабрыкі ўжо закончана. Фабрыка прыступіла да штодзённай працы. У сучасны момант працуюць 2 рэжысэрскія групы. Першая—рэжысэр Балюзэк ставіць карціну „Пеўні пераклікаюцца“ па сцэнарыю Даўгапольскага, на тэму аб жыцьці пагранічных беларускіх калектыўных гаспадарак і аб тым, як на гэтае жыцьцё рэагуюць пагранічныя сяляне-беларусы, якія знаходзяцца пад панаваньнем бела-палякаў. Фатаграфуе гэту карціну вядомы кіно-апаратар Казлоўскі, пры ўдзеле мастакоў Ягорава і Балюзэка.

Другая рэжысэрская група на чале з рэжысэрам Гардзіным ставіць карціну „Пуцяводныя агні“ (вытворчасьць Белдзяржкіно разам з «Востоккіно») па свайму сцэнарыю. Фатаграфуе яе апаратар Шлуглейт пры ўдзеле мастакоў Ягорава і Арапава.

Фабрыка Белдзяржкіно, зразумела, ня можа абмежавацца дзьвюма рэжысэрскімі групамі. У бліжэйшы час мы мяркуем пусьціць у работу яшчэ 2—3 карціны. У лік бліжэйшых пастановак уваходзяць: „Песьні вясны“ па аповесьці Якуба Коласа, «На прасторах жыцьця» па сцэнарыю Лянкевіча і Гардзіна. Гэту карціну будзе ставіць Гардзін пры ўдзеле кансультанта Лянкевіча.

Наступнай нашай працай будзе «Атаман Муха» па аповесьці Анатоля Вольнага пад такой-жа назвай. Сцэнарый зрабілі А. Вольны і Дзяржавін. Тэма гэтай карціны—прыгоды ў часе грамадзянскай вайны вядомага атамана Мухі, які быў грозою для купцоў і паноў Беларусі.

На чарзе стаіць работа па пастаноўцы карціны «У пагранічных слуцоў». Тэма трактуе апошнія асадкі белагвардзейскай эміграцыічыны, якія часам пераходзяць нашу беларускую мяжу.

Да васеньніх работ ужо гатоў сцэнарый для карціны «3-пад ярма» Язэпа Дыла.

Вось прыблізная канва нашай бліжэйшай працы.

Цяпер фабрыка працуе вельмі інтэнсыўна і калі ня будзе ніякіх спэцыфічных затрымак, праца будзе свачасова і па пляну выканана. Затрымкі-ж могуць быць і асабліва тады, калі Белдзяржкіно ня ўдасца атрымаць пазыкі на ўзмацненьня і разьвіцьцё свае вытворчасьці. Белдзяржкіно ўзбудзіла хадайніцтва перад Эканамічнай Нарадай аб водпуску на гэту справу 100.000 руб. у выглядзе кароткатэрміновай пазыкі.

Зразумела, уся гэта праца можа быць пасьпяховай толькі пры ўдзеле грамадзкасьці і пры яе падтрыманьні. Як на фабрыцы вытворчыя нарады выкрываюць яе недахваты і гэтым памагаюць ёй у працы, так крытыка, удзел і ўказаньні грамадзкасьці дапамогуць разгорнутай працы маладой кіно арганізацыі.

С. Аз.

ПА ЦЕМНЫХ КУТКОХ

(З ДАЎНО МІНУЛАГА)

I

Ранніца імгліць.

Гэтая імгла асьцярожна, памаленьку цягнецца адвекуль зьверху, яшчэ некаторы час мітусіцца у паветры, як бы гуляе ў ціхі і садзіцца на мокрую траву ды лістоты шарыя сьцены будынкаў. І здаецца, ня то імгла, ні то туман такі густы, бо ў гэтай бела-шэрай дымцы зьмяшана вёска, схлупілася і змоўкла, як-бы баіцца, каб крыкам сваім не парушыць цішыні навуклівасьці. Здаецца, што за вёскай, ну там толькі за ўзгоркам, які гушкаецца, там сонца сьмяецца і гульвоўнічае ў туманы, там сонца сьмяецца і гульвоўнічае ў туманы, там сонца сьмяецца і гульвоўнічае ў туманы

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР.

па дакладу галоўнага інжынэра будаўніцтва Асінаўскай Дзяржаўнай Раённай Электрычнай Станцыі.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Адзначыць асаблівае значэньне для справы індустрыялізацыі БССР і пачатку скарыстаньня энэргетычных багацьцяў БССР пабудову першай раённай электрычнай станцыі ў БССР. Пабудова раённай электрычнай станцыі дае магчымасьць арганізаваць новыя вытворчасьці і скарыстаць танную энэргію Асінаўскай дзяржаўнай раённай электрычнай станцыі.

2. Лічачы патрэбным, каб каляндарныя тэрміны скончэньня пабудовы станцыі, зацьверджаныя Саветам Працы і Абароны Саюзу ССР і пачатак пуску Асінаўскае электрычнае станцыі ў студзені 1930 г. зьявіліся цьвёрдымі і канчатковымі, даручыць ВСНГ і НКФ БССР падняць перад вышэйшымі органамі Саюзу ССР пытаньне аб своечасным фінансаваньні будаўніцтва за кошт саюзных сродкаў.

Адначасна даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў БССР прадугледзець у рэспубліканскім і мясцовым бюджэтах патрэбныя асигнаваньні для пашырэньня адпаведнай часткі фінансаваньня будаўніцтва за кошт БССР.

3. Даручыць Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры СНК БССР пры складаньні крэдытных плянаў прадугледзець магчымасьць дачы кароткатэрміновых крэдытаў будаўніцтву Асінаўскай дзяржаўнай раённай электрычнай станцыі, каб ня было магчымых перашкод у працы будаўніцтва.

4. Прызнаючы вельмі важнай задачай падрыхтоўку спажыўцоў энэргіі Асінаўскае электрычнае станцыі да моманту пуску яе, запрапанаваць ВСНГ БССР і адпаведным акруговым выканаўчым камітэтам зрабіць рашучыя захады да падрыхтоўкі спажыўцоў энэргіі і прадугледзець у сваіх прамыслова-фінансавых плянах і бюджэтах на 1928-29 г. патрэбныя сродкі на праектаваньне, заказ, абсталяваньне і мантаж, а таксама на абсталяваньне сетак для прыйманьня току ў гарадох.

Усю адказнасьць за своечасную падрыхтоўку спажыўцоў энэргіі на рэспубліканскай прамысловасьці ўскласьці на ВСНГ БССР, а на мясцовай прамысловасьці, камунальных прадпрыёмствах і гарадзкім асьвятленьні—на адпаведныя акруговыя выканаўчыя камітэты.

Пры гэтым на ВСНГ ускладаецца абавязак сачыць за тым, каб акруговыя выканаўчыя камітэты своечасна былі інструктаваны і захоўвалі-б каляндарныя тэрміны, па падрыхтоўцы прыманьня энэргіі для мясцовай прамысловасьці.

5. Запрапанаваць ВСНГ врабіць у жніўні месяцы 1928 г. у СНК БССР даклад аб ходзе работ па падрыхтоўцы спажыўцоў энэргіі.

6. Прыняць да ведама заяву галоўнага інжынэра, што падрыхтоўчыя работы да будаўніцтва сезону 1927-28 г. скончаны, асноўныя матар'ялы поўнасьцю падрыхтаваны, зроблен заказ на паравыя катлы, тэхнічны праэкт ужо зацьверджаны, што дае магчымасьць зараз-жа распачаць будаваньне галоўнага корпусу станцыі.

7. Прыняць да ведама заяву галоўнага інжынэра, што падрыхтоўка Асінаўскага балота да прамысловай эксплёатацыі скончана і, што ў бягучым сезоне устаноўлены 6 торпавых гарнітур для видзеньня распрацовак.

8. Прыняць да ведама заяву галоўнага інжынэра, што падрыхтоўчыя работы былі ў асноўным праведзены паводле вызначанага агульнага пляну.

9. Адзначаючы на падставе даных абсьледаваньня будаўніцтва Народным Камісарыятам Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР і дакладу галоўнага інжынэра шэраг дэфэктаў, як у видзеньні некаторых работ так і справадзачасьці, запрапанаваць кіраўніцтву будаўніцтва Асінаускай дзяржаўнай станцыі зрабіць рашучыя захады да зьнішчэньня адзначаных недахопаў за мінулы будаўнічы сезон і працаваць толькі ў адпаведнасьці са строга праверанымі тэхнічнымі плянамі і паводле ўстаноўленых каштарысаў.

10. Запрапанаваць кіраўніцтву будаўніцтва Асінаўскае дзяржаўнае раённае электрычнае станцыі зрабіць рашучыя захады для патаненьня будаўніцтва і выкананьня дырэктывы да патаненьня кошту будаўнічых работ на 15 проц., зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на зьмяншэньне накладных выдаткаў на будаўніцтву.

11. Адзначаючы, што ў кошт будаўніцтва Асінскае дзяржаўнае раённая электрычнае станцыі, зацьверджаны Саветам Працы і Абароны Саюзу ССР у 13 млн. 500 тыс. руб. не ўвашлі выдаткі на жылішчнае будаўніцтва для эксплёатацыйнага персаналу, даручыць Эканамічнай Нарадзе пры СНК БССР падняць хадайніцтва перад Саветам Працы і Абароны СССР аб дадатковым водпуску спэцыяльных крэдытаў на лініі Цэнтральнага Камунальнага Банку для видзеньня будаўнічых работ па будаванню пасёлку, з разьбіўкай каляндарнага тэрміну водпуску крэдытаў.

12. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства ўнесьці ў свой плян работ на 1928-29 г. патрэбныя сродкі на регуливаньне ракі Ворпыцы, якая зьяўляецца водапрыймальнікам ракі Ворпыцы.

13. Умовы работы рабочых і работнікаў будаўніцтва Асінаўскае дзяржаўнае раённае электрычнае станцыі праходзіць яшчэ пры невыстарчальным забясьпечаньні лекавай дапамогай. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя праз акруговыя выканаўчыя камітэты ўзмацніць лекавую дапамогу. Запрапанаваць Кіраўніцтву Будаўніцтва зьвяшчыць антысанітарныя ўмовы ў рабочых жылішчах, якія вызначаны ў апошнім акце рэвізіі Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **Н. Угараў.**

12 чэрвеня, 1928 г.
г. Менск.

ПАСТАНОВА
Савету Народных Камісараў БССР

пра зьнацьце з тав. Цукермана А. Б. абавязкаў члена Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе зьняць з тав. Цукермана, Абрама Барысавіча абавязкі члена Вышэйшага Савету Народнай гаспадаркі БССР.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **Н. Угараў.**

11 чэрвеня, 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ
Совета Народных Комиссаров БССР

об освобождении тов. Цукермана А. Б. от обязанностей члена Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет освободить тов. Цукермана, Абрама Борисовича, от обязанностей члена Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР **Н. Голодед.**

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **Н. Угаров.**

11 июня, 1928 г.
г. Минск.

Творчы пачын.

Беларусізацыя ў гомельскіх школах заходняе чыгункі.

Да 10 чэрвеня гэтага году ва ўсіх школах на гомельскім вузле Заходніх чыгунак заняткі амаль скончаны. Адбываюцца астатнія пасяджэньні. На школьных радах падагульваюцца вынікі навучаньня за 1927-28 год. Цяпер, у канцы году, можна на кожнай галіне падагуліць працу спачатку да канца. Цікава і патрэбна заўважыць, што зроблена ў справе навучаньня беларускай мове і наогул па беларусізацыі. Мінулы год—гэта перш, калі белмова была ўведзена тут у школах, як дысцыпліна. Гутарылі, вядома, вучні на белмове скрозь, але да далучэньня Гомеля да БССР вывучэньне яе было толькі хатняе.

Але прайшло трохі часу, наведаўся сюды БДТ-1 і Дзяржаўны Вандароўны Тэатр пад кіраўніцтвам тав. Балубка. Працоўныя чыгункі азнаёміліся з беларускім мастацтвам, жывым словам.

Перад пачаткам навучаньня ў школах летась Аддзелам Асьветы былі адчынены двухтыднёвыя курсы, выключна для асьветнікаў, на якіх асобна чыталіся лекцыі па беларусазнаўству для кіраўнікоў дашкольных груп, пераходзіўшых працаваць на белмове. Лекцыі зацікавілі наогул слухачоў курсаў і на іх зьяўляліся настаўнікі розных груп. У канцы курсаў слухачамі і настаўнікамі была выпушчана насьценгазэта на белмове. Ўвосень выкладаньне беларускае мовы было ўведзена тут ва ўсіх 10 школах—сямігодках, у тэхнікуме шляхоў зносін, школе фабзавуча, 8—9 групах ЦВШ, партшколах, усіх прафтэхнічных навучальных установах і на розных курсах.

Вучнёўства хутка здолела ўспрыняць спосабы выяўленьня на цісьме асабістасьцей беларускіх гукаў, чытаць і пісаць роднае слова.

Пад канец першага трыместру ў школах ужо сьпявалі беларускія песьні, рабіліся спробы выступленьняў на белмове.

На белсэкці старшынёю т. Самахвалавым даведзена была вельмі насьпеўшая неабходнасьць разгортваньня пазакласнае літаратурнае працы (вучнямі, а разам па ініцыятыве вучняў сталі высоўвацца запатрабаваньні аб заснаваньні беларускіх літаратурных гурткоў, але з гэтым спазьніліся, бо ўже сродкі былі ўжо разьмяркованы на другія гурткі. У 10-й школе, дзе загадчыкам зьяўляецца тав. Самахвалаў, гурток існаваў і шмат працаваў. Заснаваўся вучнёўскі літаратурны беларускі гурток таксама пры 4 школе, у якім шырока вялася праца. Поруч з сябрамі гуртка тут уцягваліся ў працу гуртка наогул вучні, праца была масаваю. Пад кіраўніцтвам настаўніка тав. Буцько, гэтым гуртком складзен літаратурны альбом-альманах. Прыгожы, дакладна падтасаваны збор твораў, увесь у малюнках выклікае цікавасьць і захапляе сваёю пекнатою.

За доўгі час панаваньня расейскай мовы, ні ў адной школе ў Гомелі, ні адзін год не адзначыўся такім уздымам калектыўнае творчасьці. І недарма ў часе настаўніцкай канфэрэнцыі, па пастанове журы пры Аддзеле Асьветы Заходніх чыгунак, у якім прымалі ўдзел прадстаўнікі ад школ партыйных і грамадзкіх колаў, ухвалена выдаць гуртку за гэты зборнік прэмію—творы прафэсара Карскага і альбом. Праца гуртка гэтае прэміі заслугоўвае, яна зьяўляецца ўзорнай.

У 3-й чыгуначнай школе літаратурны гурток паставіў 3 беларускія п'есы. На пярэдадні сьвята 1-е мая на раніцніку дашкольнай групаю выканана на беларускай мове напісаная настаўнікам інсцэніроўка «Працоўны Май», а ўвечары вучнямі 6, 7 груп была паставлена п'еса Міхася Чарота „Сон на балоце", якая выклікала агульнае здавальненьне моладзі і настаўніцтва. П'еса гэта праз два тыдні зноў была паставлена ў школе—ужо на платным вечары і таксама мела посьпех.

Дрэнна толькі, што для дашкольных груп літаратуры на беларускай мове вусім ня было і настаўніцтву даводзілася для інсцэніровак і сьпеваў запазычаць тэмы і перакладаць расейскія дзіцячыя п'ескі, але выходзіла ўсё-ж і тут пры старэннасьці нядрэнна.

Пасяджэньні белсэкцыі адбываліся рэгулярна і давалі належны кірунак у ходзе працы. Апроч таго, амаль пры кожнай школе для калектыву асьветнікаў існавалі беларускія гурткі, у якіх набывалі веды ў белмове ўсе настаўнікі. Праўда, вынікі яшчэ ня поўныя, але галоўнае выразна ўкладалася ў думцы і будзе зьдейсьнена дасканала пры поўным зруху на больш шырокі шлях.

Патрэбна толькі больш кніжак і своечасовае пляніраваньне ўсёй працы па беларусізацыі.

ХРОНІКА.

Бура над Менскам.

Уноч з 18 на 19 чэрвеня над горадам пранеслася вялікая бура, якая нанесла шмат шкоды. Зьнесена шмат дахаў з дамоў у прыгарадных раёнах, павалена шмат тэлеграфных і тэлефонных слупоў, у гарадзкім садзе і на сквэрах павалена каля 10 вялікіх дрэў.

Папсаваны тэлефонныя міжгароднія лініі Менск — Масква, Менск — Лагойск — Н-Барысаў, Менск—Бабруйск, Менск—Ворша і іншыя.

На гарадзкой тэлефоннай станцыі выключана 150 абанэнтаў.

У Тарасаўскім завулку ў час буры сарвала дах з электрычнай трансфармацыйнай будкі і токам забіты ламавы конь, які ў гэты час праяжджаў каля будкі.

З новыя хлебававоды ў БССР.

Белегія Нар. Кам. Гандлю СССР прыняла зацьверджаны Эканомнарадам БССР плян будаўніцтва новых хлебазаводаў на 1927-28 год.

Па гэтым пляне прадугледжваецца пабудаваць у БССР 3 новыя хлебазаводы: у Гомелі, Магілеве і Віцебску.

Пабудова гэтых хлебазаводаў будзе каштаваць 549.000 руб., з іх гомельскі хлебазавод будзе каштаваць—210.000 руб., віцебскі—219.000 руб. і магілеўскі—120.000 руб.

Арганізацыя музэю катаргі і ссылкі.

Беларускае таварыства былых палітка-таржан і ссыльна-паселенцаў адчыніе ў ліпені месяцы ў клюбе Карла Маркса музэй катаргі і ссылкі.

Для арганізацыі музэю ўжо прыбыла вялікая партыя экспанатаў, якія характарызуюць рэвалюцыйны рух у Расіі, пачынаючы з дэкабрыстаў.

У клюбе Карла Маркса для музэю адводзіцца спэцыяльна 3 пакоі для азнаямленьня шырокіх працоўных мас з рэвалюцыйным рухам.

Новыя настаўнікі для яўрэйскіх школ.

Сёлета скончылі яўрэйскія педагагічныя курсы—40 чалавек, Гомельскі яўрэйскі педтэхнікум—30 чалавек, Віцебскі—29 і Менскі—29 чалавек. Апрача таго, скончыла педагагічны факультэт 55 чалавек. Такім чынам у яўрэйскія школы БССР з новага вучэбнага году будзе прызначана 183 маладыя кваліфікаваныя настаўнікі, якіх у бліжэйшым часе Наркамасьветы разьмяркуе па акругах.

Экскурсія на хлебазавод толькі па нядзелях.

У апошнія часы вельмі часта наладжваліся экскурсіі рабочых, скужачых і вучняў на менскі хлебазавод, што значна перашкаджала нармальнай працы апошняга. Дырэкцыя хлебазаводу вырашыла ў далейшым дапускаць экскурсіі толькі адзін раз у тыдзень—у нядзелю.

Будаўніцтва яўрэйскіх школ.

Водпуск пляну Наркамасьветы, у наступным годзе міркуецца пабудаваць будынак для яўрэйскай сямёхгодкі ў Магілеве і для чатырохкамплектнай пачатковай школы ў Віцебскай акрузе.

15000 руб. на торфараспрацоўкі.

Праўленьне Белсельбанку адпусьціла цэнтральнай тарфянай станцыі Наркамзему 15000 руб. крэдыту на торфараспрацоўкі у Міхановічах.

Крэдытаваньне індывідульнага рабочага будаўніцтва.

Цэнтральнае праўленьне саюзу паперніка-хадайнічае перад Беларускай канторай камунальнага банку аб выдачы рабочым папяровай фабрыкі „Прафінтэрн" 4000 руб. крэдыту на індывідуальнае кватэрнае будаўніцтва.

Працуюць усебеларускія курсы яўрэйскіх настаўнікаў.

З 16 чэрвеня распачалі працу ўсебеларускія курсы па перападрыхтоўцы настаўнікаў яўрэйскіх школ. На курсы з усіх округ прыехала 40 чалавек настаўнікаў пачатковых школ і першага канцэнтру сямігодак. Курсы працягнуцца адзін месяц. Пры курсах працуе практыкавальная школа, дзе курсанты видуць практычную працу.

Прыватныя дамаўласьнікі не рамантуюць дамоў.

Менскі аддзел камунальнай гаспадаркі зрабіў абсьледаваньне 59 прыватных дамоў для праверкі як праводзяцца рамонты дамаўласьнікамі. Абсьледаваньне высьветліла, што кватэры рабочых не рамантуюцца. Казгас склаў 36 актаў, з якіх 17 накіроўваюцца ў парэд для ўстанаўленьня факту бесгаспадарчасьці; астатнія дамаўласьнікам зроблена папярэджаньне.

Новы парадак пераводу пая ў каапэрацыі.

Белрабсакцыя запрапанавала Цэрабкопам БССР у далейшым пры пераезьдзе найёмчыка ў другі горад не выдаваць паёў на рукі, як тое практыкавалася дагэтуль, а пераводзіць паі своечасова ў адпаведныя каапэратывы.

Прызначэньне пэрсанальнай пэнсіі старай рэвалюцыянэркі тав. Іоффэ.

Міжведамасьцевая камісія пры Нар. Ком. Сацыяльнай Забясьпекі БССР на своім апошнім пасяджэньні разгледзіла хадайніцтва аб прызначэньні пэрсанальнай пэнсіі старай рэвалюцыянэркі тав. Іоффэ.

Сваю рэвалюцыйную дзейнасьць тав. Іоффэ пачала з 1890-х галоў.

У той час яна была сэкратаром і сябрам Гомельскага Саюзу-Дэмакратычнага Партыйнага Камітэту.

За сваю рэвалюцыйную дзейнасьць тав. Іоффэ было саслана ў Сібір, дзе яна прабыла доўгі час.

У апошнія часы яна працавала машыністкай дзяржаўнага маслазаводу ў Віцебску.

Міжведамсьцевая камісія пастанавіла прызначыць з 1-га ліпеня тав. Іоффэ памесячную пэрсанальную пэнсію у суме 50 р.

Менскі дзень.

20000 рублёў адпусьціў Белсельбанк Цэнтравесскладу на закупку розных сельска-гаспадарчых машын для васеньняй пасеўнай кампаніі.

Рыхтуецца да друку падручнік па сельскай гаспадарцы для школ сялянскай моладзі і сельска-гаспадарчых школ. Гэты падручнік у бліжэйшы час будзе разгледжаны Мэтадкомам НКА.

На 6.602.000 руб. скураных тавараў і абутку рэалізавала беларуская кантора Скурсындыкату з кастрычніка 1927 г. па чэрвень г. г., што, у параўнаньні з мінулым годам, дае павялічэньне рэалізацыі скурэтавараў на 182 проц.

Марлі і паштовыя картні пачнуць прадавацца з 20-га чэрвеня ўва ўсіх газэтных кіёсках і табачных ларках з правам прадажы іх з 10 процантнай надбаўкай.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ.

Менская спартаніяда.

Каманда клюбу КІМ—на першым месцы.

У суботу 16 чэрвеня на пляцоўцы «Прафінтэрн» адбыўся фінальны матч па баскетболу жаночых каманд клюбу КІМ і БДУ, які скончыўся з вынікамі 20:16 на карысьць каманды КІМ. Гэткім чынам каманда КІМ атрымала першынства Менскай акругі.

Склад каманды пераможніцы:

Зархіна, Мільканановіч, Шапіра, Вендорф і Пішчык.

Хроніка баскетбольных спаборніцтваў.

— Каманда АБВШ атрымала перамогу над камандай Дынамо з вынікам 34:19.

— У нядзелю 17 чэрвеня матч каманд будаўнікоў і мэталістаў скончыўся з вынікам 38:13 на карысьць будаўнікоў.

— Каманда працасьветы выйграла ў АБВШ з вынікам 27:21.

Матч працасьветы—Зах. чыгунка.

У панядзелак 18 чэрвеня на пляцоўцы «Прафінтэрн», на глядзячы на дрэнае надвор'е, адбыўся матч паміж зьвяюма мацнейшымі камандамі Менску—працасьветы і Зах. чыгункі.

Матч скончыўся з вынікам 19:17 на карысьць каманды саюзу працасьветы.

Склад каманды—пераможніцы:

Рамановіч, Пішчык, Міцкевіч, Думс і Вайцэхоўскі.

Аўтадор за працай.

УДЗЕЛ БССР ВА ЎСЕСАЮЗНЫМ ДАРОЖНЫМ ЗЬЕЗЬДЗЕ.

17-га верасьня ў Маскве адбудзецца ўсесаюзны дарожны зьезд, які арганізуецца Аўтадорам РСФСР.

На абгаварэньня зьезду будуць пастаўлены агульныя тэхнічна-вытворчыя і арганізацыйна-гаспадарчыя пытаньні дарожнай справы ў СССР. На зьезьдзе будзе арганізавана спэцыяльная выстаўка па дарожнай справе.

Для ўдзелу ў гэтым зьезьдзе ад БССР выедзе делегацыя ў складзе старшыні праўленьня Аўтадору БССР тав. Станкоўскага, кіраўніка дарожнай сэкцыі Аўтадору т. Мартынава, адказнага сэкратара праўленьня Аўтадору БССР т. Іванова, старшыні Менскага акруговага аддзяленьня Аўтадору т. Нахільніцкага і праўстаўніка ад Віцебскага акруговага аддзяленьня Аўтадору.

Для падрыхтоўкі да зьезду, праўленьне Аўтадору БССР мяркуе склікаць усебеларускую дарожную нараду, на якой будуць абгаворваны пытаньні аб дарожным будаўніцтве ў БССР і ўдзеле ў ёй арганізацыі Аўтадору.

ВЫПУСК КУРСАЎ ПА ПЕРАКВАЛІФІКАЦЫІ ШОФЭРАЎ.

22-га чэрвеня адбудзецца выпуск курсаў па перакваліфікацыі шофэраў, арганізаваных саюзам транспартнікаў і Аўтадорам.

Усяго курсы маюць выпусьціць 45 кваліфікаваных шофэраў.

ПРЫКЛАДНАЯ ЯЧЭЙКА АЎТАДОРУ.

Ячэйка Аўтадору пры 15-м дарожным вучастку разгарнула сваю дзейнасьць.

Па ініцыятыве гэтай ячэйкі быў склікан сход сялян вёскі Цэрабель, Пухавіцкага району, Менскай акругі, на якім было пастаноўлена правесьці рамонт дарогі, якая праходзіць праз гэту вёску. Для рамонту гэтай дарогі ўжо падвезены ўсе неабходныя матар'ялы, як камень, пясок і г. д.

Тэхнічнае кіраўніцтва дарогі ўзяла на сябе сябры вышэй памянёнай ячэйкі.

У далейшым ячэйка мае на мэце правесьці шэраг іншых работ па спраўленьні дарог сёлам мясцовага насельніцтва.

Палітасьвета на вёсцы.

ХАТА-ЧЫТАЛЬНЯ ДА ДНЮ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ БЕЛАРУСІ АД БЕЛАПАЛЯКАЎ.

Падрыхтоўка да дню вызваленьня Беларусі ад белапалякаў павінна распачацца загадзя.

Своячасовая падрыхтоўка дасьць магчымасьць прыцягнуць да ўдзелу ўсё насельніцтва і сьвята зрабіць масавым.

Загадзя кожнай хаце-чытальні трэба распрацаваць плян як падрыхтоўка працы, так і самога сьвяткаваньня і ўзгадніць яго з мясцовымі партыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі.

Дзеля больш пасьпяховае падрыхтоўчае працы неабходна скарыстаць ня толькі настаўніка, камсамол, але і ўвесь сялянскі актыў.

Зараз-жа па ўсіх вёсках трэба ўзмацніць правядзеньне гутарак і гадосных чытак аб значэньні сьвята „Дзень вызваленьня Беларусі ад белапалякаў", аб нашых дасягненьнях у сацыялістычным будаўніцтве, аб становішчы рабочых і сялян у Заходняй Беларусі, аб міжнародным становішчы і г. д. Напярэдадні сьвята вельмі важна валадзіць масавую вечарыну ўспамінаў аб часох белапольскай акупацыі.

Драмгуртку трэба своячасова падрыхтаваць адпаведную п'есу, інсцэніроўку, сьпевы, дэклямацыю.

У бібліятэцы трэба сабраць і, калі няма, набыць літаратуру, прысьвечаную гэтаму дню і Заходняй Беларусі, наладжваць яе выстаўку і прасоўваць у гушчы сялян. Рэдкалегіі трэба таксама паклапаціцца і выдаць насьценгазэту з такім, прыкладна, зьместам:

а) (перадавіца) 11-ае ліпеня—сьвята ўсіх працоўных,

б) як жывецца рабочаму і селяніну ў Заходняй Беларусі,

в) прысуд над Грамадою,

г) Нашы дасягненьні ў сацыялістычным будаўніцтве,

д) успаміны сялян, удзельнікаў грамадзянскае вайны і г. д.

У самы дзень сьвята неабходна арганізаваць масавы мітынг.

Увечары — урачыстую вечарыну, прысьвечаную дню вызваленьня Беларусі ад белапалякаў і спэктакль, або кінэ.

Як у часе падрыхтоўчае працы, так і ў самы дзень сьвята трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўзмацненьне працы ячэек МОПР'у, арганізацыю новых ячэек МОПР'у і збор грошай у шэрагі МОПР'у і збор ахвяраваньняў на карысьць палітзьняволеных.

Ва ўсёй працы раім скарыстоўваць наступную літаратуру:

1) „Крывавай пуцявінай" (зборнік мастацкіх матар'ялаў;

2) „Да дню вызваленьня Беларусі ад белапалякаў» (зборнік);

3. «Чырвоная сялянская вечарынка» (зборнік мастацкіх матар'ялаў);

4. „Беларуская Работніцка-Сялянская Грамада" (зборнік);

5. «Памятник Борцам, погибшим за освобождение Белоруссии»;

6. „Босыя на вогнішчы"—М. Чарот (поэма);

7. «Два»—А. Вольны (аповесьць);

8. „На зломе"—Я. Неманскі;

9. «Золак»—М. Нікановіч;

10. «42 дакументы»—М. Зарэцкі;

11. «Буралом»—Я. Бядулі;

12. „На рубяжы"—Тарас Гушча (Якуб Колас);

13. «Безназоўнае»—Янкі Купала;

14. „Трэскі на хвалях"—Цішка Гартны і інш.

Паказаныя кніжкі можна набыць на ўсіх кнігарнях Бел. Дзярж. Выдавецтва.

Дакладчыкі павінны скарыстаць, як дадатковы матар'ял, артыкулы з газэт «Сав. Беларусь» і „Зьвязда" аб працэсе над Беларускаю Раб.-Сялянск. Грамадою і міжнародным становішчы ў апошні час.

М. Сеўрук.

За арганізацыю ячэек „Аўтадору".

Кожнаму селяніну добра вядома становішча нашых дарог. Улетку і зімою яшчэ сяк-так, а восень і вясна прыносяць нямала страт. Вельмі багата ў нас такіх дарог, па якіх можна ехаць толькі ўзімку. Але ўсё-ж, ня гледзячы на гэта, удзел самога насельніцтва ў напраўцы гэтых дарог надта малы. „Езьдзілі дзяды—праедам і мы",—так можна пачуць ад сялян. Ломім калёсы, душым коняй, а езьдзім і не шыканаем.

А ўзяць вуліцы вёсак, шмат дзе рух магчымы толькі ўлетку і ўзімку.

Усё гэта ставіць перад намі вельмі важную задачу—узнаціць працу па рамонту дарог, прыцягнуць да гэтай справы ўсё сялянства.

Трэба стварыць навакол гэтага пытаньня шырокую грамадзкую думку, у кожнай вёсцы, сельсавеце арганізаваць ячэйку «Аўтадор», уцягнуць як мага больш у яго шэрагі сялян.

Палепшыць дарогі толькі сіламі ўрадавых органаў—рэч вельмі цяжкая. Палепшыць нашы дарогі можна толькі пры самым актыўным удзеле мілённых мас сялянства. Гэта павінны памятаць нашы хаты-чытальні, культурныя працаўнікі і камсамол.

П—т.

Хаты-чытальні павінны працаваць без перабояў.

Улетку частка хатнікаў ідзе ў адпачынак, частка едзе на курсы, такім парадкам на месяц-паўтара хата-чытальня застаецца без аспоўнага працаўніка і падчас зусім зачыняецца.

Такая пастаноўка справы няправільная. Культурнае абслугоўваньне насельніцтва павінна праводзіцца хатай-чытальняй без перабояў.

Кожны хатнік павінен стала прадумаць гэта пытаньне.

Перш за ўсё трэба прыблізіць да хаты-чытальні ўвесь актыў, студэнтаў і вучняў-адпускнікоў; разам з імі распрацаваць шэраг канкрэтных мерапрыемстваў, складзьці каляндарны плян працы і вызначыць дзяжурстны актыву ў хаце-чытальні.

Калі загадзя да адпачынку, або да курсаў будзе праведзена ўся падрыхтоўчая праца, дык культурнае абслугоўваньне насельніцтва будзе ісьці без перабояў і часовая адсутнасьць хатніка ані не адаб'ецца на ўсёй працы хаты-чытальні.

М.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

(НА 20-VI 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз.—прад. 4—60, куп. 4—58.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—08,5 куп. 5—06,5

Абл. 2 сял. паз.—куп. 5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—03,5 куп. 5—01,5

Абл. 10 пр. паз. 27 г.—прад. 25—67, куп. 25—57.

Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 120—50, куп. 118—50.

Абл. 12 проц. паз.—прад. 100—69, куп. 100—64.

Абл. 6 проц. паз. індустр.—прад. 24—69, куп. 24—59.

Паштовая скрынка.

Фэльчару Шабуні.

На Вашаму допису аб пасылцы Вас на мэдфак БДУ, ЦП саюзу мэдсанпрацы паведамляе, што «ў гэтым 1928 годзе сакі камандыровак фэльчэрам не дае. Згодна правіл прыёму Наркамасьветы БССР, фэльчары падаюць заявы непасрэдна ў праўленьне БДУ.

Узрост фэльчароў ізноў абмяжован да 35 год».

Папраўка.

У пачатку артыкулу «Жывая сувязь магілеўскага акрэсмаддзелу» («С. Б.» № 136) надрукавана: «Справа гэтая распачалася яшчэ ўвесну 1928 году», павінна быць: «1926 году».

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА**

КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
Зачыненьне сэзону.
Серада, 20 чэрвеня. У другі раз.
Ю. Юр'іна. „КАЛІ СЬПЯВАЮЦЬ ПЕУНІ".
П'еса ў 5 дзеях і 7 абразох.
Пераклад Міцкевіча. Мастак Ю. Гольц.
Пастаноўка М. Міцкевіча. Музыка І Гіттарца.
Пачатак а 8 вал. гадз.
Білеты ў касе Тэатру з 12 да 2 і ад 5 да 9 гадз., у Рабочай касе з 11 з пал. да 2 і з 4 да 6 гадз.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». 3 аўторка, 19 чырвеня грандыёзны фільм „Лішнія людзі" Пастаноўка рэжысэра Разумнага. Пачатак а 8 гадзіне.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". 3 аўторка, 19 чэрвеня нямецкі мастацкі фільм „ПРАКУРОР ІОРДАН" ў 7 частках. Пачатак а 7 гадз. 15 хвілін.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». 3 аўторка 19 чэрвеня „СЫНАБАР" Дзьве серыі (13 частак) у адзін сеанс

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». 3 аўторка 19 чэрвеня „КАХАНЬНЕ Ў 16 год" Чарговая пастаноўка: «КАР'ЕРА ТАНЦОРКІ».

ДА ЎСІХ НАШЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ.
ІДУЧЫ У ВОДПУСК ЦІ НА КАНІКУЛЫ,
ПАВЕДАМІЦЕ ў кантору ваш новы адрас і вам будзе накіравана газэта па новаму адрасу.
Пры перамене адрасу паведамляйце ваш стары адрас, праз каго вдадзена падпіска і на які тэрмін.
Бяз гэтых вестак перамена адрасу РАБІЦЦА НЯ БУДЗЕ.
КАНТОРА.

Даводзіцца да ўсеагульнага ведама, што прамыслова-скарнижна-сырамятная арцель „ТРУД" з 15-га ліпеня ліквідуецца. Усе претэнзіі накіроўваць у ліквідацыйную камісію да 15 ліпеня на адрасу: Менск, Ленінская вул., № 15.

КАЧАГАРЫ,
якія не прайшлі навучаньня па праграме тройкі па навучаньню качагараў
ДА 1-га СТУДЗЕНЯ 1929 ГОДУ,
будуць зьняты з працы
згодна інструкцыі ВСНГ СССР і НКП СССР ад 7 мінеча 1926 г. № 147-355 і пастановы СПА ад 11 сакавіка 1927 году.
У зьвязку з гэтым, качагарам, якія не прайшлі навучаньня, належыць зараз-жа паведаміць аб гэтым у адпаведныя акруговыя інспэкцыі працы для своячасовага правядзеньня навучаньня іх інструктарамі тройкі.
Ст. Тэхнічны Інспэктар НКПБ МІНКОЎ.

НЕ ПАЗЬНІЦЕСЯ З ПАДПІСКАЙ
НА 2-ое ПАЎГОДЗЬДЗЕ
на самую папулярную распаўсюджаную беларускую
ГАЗЭТУ
„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"
Орган Ц. В. К. Б. С. С. Р.
ЧАТЫРЫ РАЗЫ Ў МЕСЯЦ РАЗАМ З ГАЗЭТАЙ ПАДПІСЧЫКАМ РАССЫЛАЮЦЦА БЯСПЛАТНА ДАДАТКІ.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
На 1 месяц — 90 к. | На 3 м-цы 2 р. 70 к.
» 2 м-цы 1 р. 80 к. | » 6 м-цаў 4 р. — к.
На год 8 р. — к.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у Менску—у канторы газэты рог вуліц Ленінскай і К. Маркса; у правінцыі—упаўнаважанымі канторы і ўсімі паштова-тэлеграфнымі аддзяленьнямі і аддзяленьнямі Беларускага Дзяржаўнага